*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# Наша слова

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года

№ 32 (1235) 12 ЖНІЎНЯ 2015 г.

## 105 - я ўгодкі з дня нараджэння Ларысы Геніюш







8 жніўня традыцыйныя ўрачыстасці да дня нараджэння Ларысы Геніюш распачаліся ў Зэльвенскай царкве. Адмыслова, як і штогод, адбылася служба ў гонар паэткі. А затым у дворыку царквы побач з помнікам Ларысы Геніюш сабраліся ўсе, хто прыехаў з розных гарадоў і мястэчак Беларусі, каб ушанаваць яе памяць.

Міхась Скобла распавёў пра новую кнігу ў якой змешчнаныя непублікаваныя раней геніюшаўскія вершы, успаміны пра яе тых, з кім давялося прайсці няпростыя жыццёвыя шляхі, і ўдзячнасьці ад людзей пісьменніцы і грамадзянцы.

Атмасфера ў дворыку панавала несамавітая, дружалюбная, цёплая, Таццяна Матафонава праспявала песню на словы Дубоўкі, ў якія дадаліся словы Ларысы Геніюш.

Выступіла паэтка Данута Бічэль, узгадала як першы раз прыехала да Ларысы Геніюш:

- Усё шчаслівае, што было ў маім жыцці, згадваецца тут у Зэльве. Была ў мяне тут духоўная мама, і калі я патрапіла да яе, жыццё маё змянілася цалкам і стала аграмадным, прыгожым. Тут у мяне з’явілася неабсяжная прастора і вечнасць, гэта з’явілася, калі я прытулілася да Ларысы Геніюш. І гэтае падарожжа ў мяне прадаўжаецца, нават не гледзячы на тое, што яе побач з намі ўжо няма. Вось, калі ласка, друкуюць і цяпер яе кніжкі. Я задавала сабе пытанне - ці падабаецца ёй, што яе кнігі пачалі друкаваць пасля смерці? А цяпер я зразумела, што ў чалавека ёсць лёс, паміж якім ёсць смерць, але гэтая смерць - яна як бы і не існуе. Ёсць жыццё і паэт у ім вечны, ён не памірае.

З Палтавы прыехала ў Зэльву паэтэса Іна Снарская, якая прачытала верш Ларысы Геніюш у сваім перакладзе па-ўкраінску, а потым свой верш па-беларуску, бо сама Іна родам з Полацка.

*(Заканчэнне на ст. 5.)*



ISSN 2073-7033

## 80 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Падлужнага



**Аляксандр Іосіфавіч ПАДЛУЖНЫ** (16.08.1935, в. Залессе Мсціслаўскага раёна - 21.11.2005, г. Менск) нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча (1954), філалагічны факультэт БДУ (1959). Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Раснянскай СШ Дрыбінскага раёна.

Вучыўся ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа (1962-1964). Пачаў навуковы шлях з пасады малодшага навуковага супрацоўніка, вырас да акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў (1997-2002). Кіраваў Інстытутам мовазнаўства: намеснік дырэктара па навуковай рабоце (1983-1989), дырэктар (1989-2003).

Абараніў кандыдацкую (1967) і доктарскую (1981) дысертацыі. Доктар філалагічных навук (1982), прафесар (1989), акадэмік АН Беларусі (1994).

Заснавальнік навуковай фанетычнай школы ў Беларусі. Намеснік старшыні Дзяржаўнай камісіі па ўдасканаленні беларускага правапісу. Пад яго кіраўніцтвам быў падрыхтаваны праект новай рэдакцыі "Правіл беларускай арфаграфіі і пунтктуацыі". Адзін з актыўных стваральнікаў "Закона аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Падрыхтаваў 12 кандытаў навук, сярод яго вучняў некалькі дактароў навук.

Аўтар больш за 150 навуковых прац, у тым ліку 16 манаграфій. Асноўныя працы: "Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы" (1969), "Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы" (1977), "Фанетыка слова ў беларускай мове" (1983), суаўтар кнігі "Фанетыка беларускай літаратурнай мовы" (1989), "Беларуская мова для тых, хто гаворыць па-руску" (1990), "Падручнік беларускай мовы. Для самаадукацыі" (1994), хрэстаматыі "Вусная беларуская мова" (1990), зборнік "Пытанні культуры пісьмовай мовы" (1991), вучэбны дапаможнік "Фанетыка беларускай мовы" (1984), суаўтар і навуковы рэдактар "Беларускай граматыкі" (Ч. 1, 1985) і інш. Галоўны рэдактар штогодніка "Беларуская лінгвістыка" (з 1989) і часопіса "Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук" (з 1997).

Прысуджана ганаровае званне "Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь" (1999). Узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны" і шматлікімі Ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі.

***Вікіпедыя.***

*(Пра А. Падлужнага чытайце на ст. 2.)*

## Супольная малітва беларусаў і японцаў

9 жніўня ў Менскім Чырвоным касцёле на святой імшы прысутнічаў амбасадар Японіі Цікахіта Харада і ўдзельнічаў у сумеснай малітве беларускага і японскага народаў аб ахвярах, пацярпелых у Хірасіме, Нагасакі, Фукусіме і на Чарнобыльскай АЭС.

Ксёндз-пробашч Уладзіслаў Завальнюк заклікаў прысутных да малітвы за ўсіх людзей, якія пацярпелі ад ядзерных выбухаў і выпрабаванняў, ад наступстваў радыяцыі, якія перажываюць новыя пакаленні людзей ў Японіі і Беларусі. Амбасадар Японіі Цікахіта Харада ўзгадаў аб трагедыі японскага народа, калі за некалькі хвілін загінулі каля 70.000 чалавек. Ён падкрэсліў неабходнасць захавання міру на планеце і супольнай малітвы за мір у свеце. Японія прытрымліваецца трох неядзерных прынцыпаў: не мець, не рабіць і не ўвозіць ядзернай зброі.

6 і 9 жніўня адзначалася 70- годзе бамбардзіровак японскіх гарадоў Хірасімы і Нагасакі. 9 жніўня ў Нагасакі званіў звон аб ахвярах выбуху. У гэты ж дзень у Менску ля Чырвонага касцёла таксама гучаў памінальны звон.

У 2000 г. каля касцёла быў устаноўлены помнік "Звон Нагасакі" (які зрабіў японскі архітэктар Марыяма) у памяць ахвяр Хірасімы, Нагасакі і Чарнобыля, дакладная копія звона "Анёл", уцалелага пасля атамнай бамбардзіроўкі. Такі падарунак гораду быў зроблены японскім каталіцкім біскупствам Нагасакі. Кожны год 26 красавіка у дзень катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у Менску "Звон Нагасакі" адначасова звоніць са званамі ў Нагасакі - ва ўшанаванне ахвяр радыяцыі.

29 жніўня 2001 года ля касцёла св. Сымона і Алены была ўсталявана капсула з зямлёй з вёскі Грушаўка Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці. *"Няхай звон звaніць па нашых душах"*, - папрасілі жыхары вёскі. 29 жніўня (гэты дзень з'яўляецца Міжнародным днём дзеянняў супраць ядзерных выпрабаванняў) 2011 года на тым жа месцы была прымацавана капсула з зямлёй з Сяміпалацінскага палігона. 12 снежня 2013 года ў Менск была дастаўлена зямля з Аламагорда, штат Нью - Мексіка, дзе выпрабоўвалася першая атамная бомба.

У Токіа родныя пацярпелых і тыя людзі, якія перажылі бамбардзіроўкі, таксама сабраліся 9 жніўня на жалобныя мерапрыемтствы а 11 гадзіне.

15 жніўня ў касцёле адзначаецца памяць польскага святога Максіміляна Марыя Кольбе. Ён некаторы час вёў місіянерскую дзейнасць у Японіі, заснаваў манастыр ля горада Нагасакі, семінарыю і газету на японскай мове. Ён заснаваў кляштар не ў лепшым месцы, бо ад неселенага пункта будынак аддзяляла гара. Але калі ў 1945 годзе горад быў разбураны атамнай бомбай, кляштар не пацярпеў, бо быў з іншага боку гары, і браты-хрысціяне засталіся цэлыя.

***Эла Дзвінская.***

# Аляксандр Іосіфавіч Падлужны

*16 жніўня 2015 г. спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння Заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, вядомага беларускага лінгвіста, доктара філалагічных навук, прафесара, акадэміка **Аляксандра Іосіфавіча Падлужнага**.*

А.І. Падлужны нарадзіўся 16 жніўня 1935 г. у в. Залессе Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1954 г. скончыў Мсціслаўскае педвучылішча, у 1959 г. - аддзяленне беларускай мовы і літаратуры Белдзяржуніверсітэта, пасля заканчэння БДУ працаваў настаўнікам у сельскай школе, у 1982 г. абараніў доктарскую дысертацыю, у 1989 г. стаў прафесарам, у 1994 г. - акадэмікам НАН Беларусі.

З 1962 г. А.І. Падлужны назаўсёды звязвае сваё жыццё і дзейнасць з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і беларускім мовазнаўствам. Тут у 1964 г. ён скончыў аспірантуру пад кіраўніцтвам вядомага ленінградскага лінгвіста Р.Р. Пятроўскага і абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы", затым працаваў на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка інстытута. З 1969 г. А.І. Падлужны працуе загадчыкам лабараторыі эксперыментальнай фанетыкі (з 1990 года - аддзел эксперыментальнай фанетыкі), з 1992 г. узначальвае аддзел сучаснай беларускай мовы, з 1983 г., працуе на пасадзе намесніка дырэктара інстытута па навуковай рабоце, з 1989 па 2003 г., з'яўляецца дырэктарам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Адначасова з 1997 па 2002 г. А.І. Падлужны быў акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.

А.І. Падлужны - аўтар больш за 150 навуковых прац, у тым ліку 16 манаграфій па розных праблемах беларускай фанетыкі і фаналогіі, сучаснай беларускай лексікалогіі, граматыкі, правапісу і культуры мовы, моўнай палітыкі, з'яўляецца заснавальнікам беларускай фанетычнай школы. Ён стварыў у Інстытуце мовазнаўства лабараторыю эксперыментальнай фанетыкі, у якой пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле праведзены даследаванні вуснай беларускай мовы. У манаграфіі "Фаналагічная сістэма беларускай мовы" (1969) вучоны ўпершыню даследаваў фанемны склад беларускай мовы і разгледзеў механізм функцыянавання гукаў, якія не паддаецца непасрэднаму назіранню. Гэта даследаванне з'явілася тэарэтычнай асновай для эксперыментальнага вывучэння гукаў беларускай мовы. У кнізе "Гукі беларускай мовы" (сумесна з В.М. Чэкманам, 1973) ім разгледжаны асаблівасці ўтварэння галосных і зычных гукаў беларускай мовы. Такое апісанне ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве ажыццёўлена на эксперыментальным матэрыяле (рэнтгенаграм, палатаграм, лінгваграм, адантаграм дыктараў, якія валодаюць літаратурнымі нормамі вымаўлення). У манаграфіі даследаваны месца і спосаб утварэння гукаў паводле даных палатаграфіі і кінарэнтгенаграфіі, прапанавана артыкуляцыйна-фізіялагічная класіфікацыя зычных і галосных гукаў, дадзена апісанне асноўных характарыстык артыкуляцыйнай базы беларускай мовы. Кніга дала пачатак стварэнню навуковай апісальнай фанетыкі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, якая да сённяшняга дня з'яўляецца базай усёй вучэбнай літаратуры па фанетыцы і фаналогіі беларускай мовы.

У манафафіі "Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы" (1977) на аснове дадзеных самых новых на той час электронна-акустычных прыбораў прааналізаваны ўласцівасці вуснай беларускай мовы, якія абумоўліваюць яе падзел на гукі і дазваляюць ажыццявіць фанемную класіфікацыю. У доктарскай дысертацыі А.І. Падлужнага "Фанетычная сістэма беларускай мовы" (1981) упершыню ў беларускім мовазнаўстве прыведзены атрыманыя эксперыментальным шляхам звесткі пра акустычную будову маўлення і асаблівасці яго ўспрымання, зроблена іерархічная класіфікацыя акустычных прымет маўленчага сігналу, устаноўлена сегментная структура беларускага маўлення і прапанавана акустычная класіфікацыя гукаў на аснове гэтай структуры. Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле А.І. Падлужнага ў Інстытуце мовазнаўства праведзены буйныя даследаванні фанетычнай сістэмы беларускай мовы, вынікі якіх абагульнены ў манаграфіях "Фанетыка слова ў беларускай мове" (1983), "Фанетыка беларускай літаратурнай мовы" (1989), а таксама ў шэрагу артыкулаў, прысвечаных тэарэтычным праблемам беларускай фанетыкі і фаналогіі.

Значнае месца ў навуковай дзейнасці А.І. Падлужнага займаюць праблемы нармалізацыі беларускага літаратурнага маўлення. Ён з'яўляецца членам рэдакцыйнай калегіі і адным з аўтараў нарматыўнага "Слоўніка беларускай мовы: Арфаэпія, арфаграфія, акцэнтуацыя, словазмяненне" (1987), а таксама аўтарам раздзелаў "Фаналогія" і "Арфаэпія" (сумесна з акадэмікам М.В. Бірылам) у акадэмічнай "Беларускай Граматыцы" (ч. 1, 1985). Менавіта гэтыя фундаментальныя працы да сённяшняга дня застаюцца найбольш аўтарытэтнымі даведнікамі па беларускай мове, дзякуючы якім удалося стрымаць дэструктыўныя тэндэнцыі ў сістэме беларускай літаратурнай мовы ў канцы XX ст. і захаваць адносную стабільнасць норм беларускай літаратурнай мовы і яе функцыянаванне ў грамадстве.

У 90-я гады мінулага стагоддзя акадэмік А.І. Падлужны фактычна ўзначаліў працу ў краіне па ўдасканаленні беларускага правапісу. Ён быў намеснікам старшыні Дзяржаўнай камісіі па ўдасканаленні беларускага правапісу, вынікам дзейнасці якой сталі "Высновы", дзе былі сфармуляваны асноўныя падыходы да падрыхтоўкі змяненняў існых правапісных норм. А.І. Падлужны ўзначаліў і рабочую групу па падрыхтоўцы праекту новай рэдакцыі "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі". У выніку напружанай і карпатлівай працы рабочая група падрыхтавала такі праект, які з'яўляецца больш паслядоўным і кампактным у параўнанні з існым тады і які пасля ўвядзення ў дзеянне павінен быў забяспечыць адзінства правапісных норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы і яе паспяховае вывучэнне перш за ўсё ў сферы школьнай адукацыі. Адначасова А. І. Падлужны як кіраўнік рабочай групы і аўтарытэтны спецыяліст у гэтай галіне праводзіў вялікую прапагандысцкую работу па растлумачэнні сутнасці і зместу прапанаваных змен у беларускім правапісе, пра што сведчылі яго рэгулярныя публікацыі ў перыядычным друку, у прыватнасці ў "Настаўніцкай газеце" за 2005 год.

Шэраг прац А.І. Падлужнага непасрэдна адрасаваны тым, хто практычна вывучае беларускую мову. Ён адзін з аўтараў кнігі "Беларуская мова для небеларусаў" (1973; 2-е выд. 1978, на рускай мове). (Менавіта гэтая кніга была першым падручнікам беларускай мовы ў нядзельнай беларускай школе г. Прыазёрск у Казахстане ў 1990 г., *рэд.*) Трэцяе істотна перапрацаванае і дапоўненае выданне гэтай кнігі выйшла пад назвай "Беларуская мова для тых, хто гаворыць па-руску" (1990). А.І. Падлужны - навуковы рэдактар і адзін з аўтараў кнігі "Беларуская мова: Цяжкія выпадкі фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі" (1987), хрэстаматыі "Вусная беларуская мова" (1990), зборніка "Пытанні культуры пісьмовай мовы" (1991). У суаўтарстве ім напісаны вучэбны дапаможнік "Фанетыка беларускай мовы" (1984), а таксама "Практыкум па фанетыцы беларускай мовы" (1989) і інш. А.І. Падлужны быў членам рэдкалегіі і адным з найболып актыўных аўтараў энцыклапедыі "Беларуская мова" (1994), якая дагэтуль з'яўляецца найбольш поўным і аўтарытэтным даведнікам па самых разнастайных пытаннях сучаснай беларускай мовы.

У сферы навуковых зацікаўленняў акадэміка А.І. Падлужнага знаходзяцца таксама праблемы беларускай лексікалогіі і беларускай навуковай тэрміналогіі. Пад яго рэдакцыяй апублікавана манаграфія "Пытанні тэорыі і практыкі беларускай навуковай тэрміналогіі". Вялікую практычную, у тым ліку і кансультацыйную, работу ён ажыццяўляў як старшыня Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Шырока вядома навуковая дзейнасць А.І. Падлужнага і за межамі нашай краіны. На працягу многіх гадоў ён з'яўляўся членам Камісіі па фанетыцы і фаналогіі пры Міжнародным камітэце славістаў, членам рабочай групы Міжнароднай камісіі па "Агульнаславянскім лінгвістычным атласе", кіраўніком беларускай нацыянальнай групы АЛА, прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы гэтага буйнейшага славістычнага праекту XX-XXI стст.

Сваю шматгранную навуковую работу А.І. Падлужны спалучаў з вялікай навукова-арганізацыйнай дзейнасцю. Працуючы на працягу 20 гадоў намеснікам дырэктара па навуковай рабоце і дырэктарам Інстытута мовазнаўста імя Якуба Коласа НАН Беларусі, А.І. Падлужны фактычна ажыццяўляў каардынацыю ўсёй лінгвістычнай навукі ў Беларусі, а на пасадзе акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі вызначаў кірункі даследаванняў у галіне ўсёй гуманітарнай навукі ў краіне.

Адначасова ў дзейнасці акадэміка А.І. Падлужнага вялікае месца займала работа па падрыхтоўцы філалагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Ён падрыхтаваў 12 кандыдатаў навук, сярод яго вучняў некалькі дактароў навук. Акрамя таго, на працягу многіх гадоў А.І. Падлужны чытаў лекцыі па беларускай мове для студэнтаў філалагічнага факультэта БДУ, працаваў старшынём ДЭК, быў членам Прэзідыума навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па падручніках, узначальваў савет па абароне доктарскіх дысертацый пры Інстытуце мовазнаўства, з'яўляўся членам савета па абароне дысертацый пры БДУ.

Навуковая, навукова-арганізацыйная дзейнасць і работа па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне беларускага мовазнаўства А.І. Падлужнага атрымалі высокую адзнаку грамадскасці і дзяржавы. У 1989 г. ён абраны членам-карэспандэнтам, а ў 1994 г. - акадэмікам НАН Беларусі. Як таленавіты арганізатар мовазнаўчай навукі ў Беларусі А.І. Падлужны ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага савета БССР (1983), ордэнам "Знак Пашаны" (1986), яму прысвоена званне Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (1999).

***Паводле***
***А.А. Лукашанца.***

## VIA SCIENTIARUM

### (З гісторыі беларускай адукацыі)

У Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адкрылася выстава "VIA SCIENTIARUM. (З гісторыі беларускай адукацыі)", дзе прадстаўлены матэрыялы, якія захоўваюцца ў аддзеле старадрукаў і рэдкіх выданняў.









Рэтраспектыва экспазіцыі дае магчымасць прасачыць складаны і цікавы працэс развіцця адукацыі на беларускіх землях ад даўніх часоў да саракавых гадоў XX стагоддзя.

На выставе прадстаўлены выданні, дзе асэнсоўваецца шматграннае значэнне асветніцкай дзейнасці Е. Полацкай, Ф. Скарыны, С. Полацкага не толькі для нашых зямель, але і для сусветнай гісторыі і культуры.

Сярод экспанатаў выставы - "Памятная кніжка Магілёўскай дырэкцыі народных вучылішчаў", якая датуецца 1890 г., навукова-педагагічныя працы вядомых аўтараў, даведачныя выданні аб адукацыйных установах, часопісы і інш.

Наведвальнікі экспазіцыі маюць унікальную магчымасць убачыць разам шэраг матэрыялаў, якія на сённяшні дзень з'яўляюцца бібліяграфічнай рэдкасцю і маюць гістарычную каштоўнасць.

***Святлана Паўлавіцкая**,*
*галоўны бібліятэкар аддзела старадрукаў*
*і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі*
*Рэспублікі Беларусь.*

## АБ'ЯВА

**З 3 па 21 жніўня сядзіба ТБМ працуе па летнім раскладзе:**
**штодня з панядзелка па пятніцу з 17 да 19 гадзін.**
**Субота і нядзеля не працуем.**
**Кніжная выстава пачынае працаваць з 24 жніўня з 15.00 да 19.00.**

# З ШАНАВАННЕМ РОДНАГА СЛОВА

Сапраўдны пісьменнік тонка адчувае не толькі слова, але і ўласцівыя яму адценні, рупіцца, дбае пра самабытнасць мовы. Гэта датычыць і **Алеся Ветаха**, пісьменніка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа. Ён аўтар кніг прозы "Ружовая знічка" (1994), "Хроніка смутку" (1999). Ягоныя творы друкаваліся ў калектыўных зборніках "Карані", "Вальс пад журлівымі таполямі", "У Храме зямнога кахання", "Самая чароўная кветка", "Пакуль б'ецца сэрца…", часопісах "Полымя", "Маладосць", "Першацвет", газетах "Літаратура і мастацтва", "Чырвоная змена", "Голас Радзімы" і інш.

Псеўданім *Алесь Ветах* абраў для сябе Алесь Бельскі, знакаміты беларускі літаратуразнавец і крытык, доктар філалагічных навук, прафесар БДУ, аўтар шматлікіх навуковых і навукова-метадычных прац пра беларускую літаратуру XX - пачатку XXI стагоддзя. Прац, якія характарызуюцца не толькі глыбінёй аналізу мастацкіх твораў, але і тонкім разуменнем адметнасцяў, якія маюць дачыненне да архітэктонікі твора, яго вобразнай сістэмы і моўна-выяўленчых сродкаў.

І вось новая, прыемная сустрэча з Алесем Ветахам. На гэта раз - з ягонымі кнігамі прозы **"Сны дзяцінства: аповесці, апавяданні"** (Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2014. 259 с.) і **"Хрыстос між нас: апавяданні, аповесці"** (Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2015. 223 с.). Трэба адзначыць, што творы вызначаюцца майстэрствам пабудовы сюжэтаў, глыбінёю псіхалагізму. А яшчэ - самабытнаю моваю (слова- і формаўжываннем, адмысловым сінтаксісам). Бясспрэчнай аздобаю ягоных твораў з'яўляецца "пазаслоўнікавая" лексіка - словы, не ўключаныя ў пяцітомны "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" *(1977-1984)*. Гэтыя "бяздомныя" словы, якія ўжываюцца ў мастацкіх і навуковых тэкстах, у мове сродкаў масавай інфармацыі, нарэшце знайшлі надзейны прытулак - пададзены ў працы А. Каўруса "Словаклад: слоўнік адметнай лексікі" *(Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2013. 328 с.)*. Некаторыя з гэтых слоў увайшлі ў найноўшыя слоўнікі, у тым ліку - у такі аўтарытэтны даведнік, як "Слоўнік беларускай мовы" *(Мінск: Беларуская навука, 2012. 916 с.)*, навуковымі рэдактарамі якога з'яўляюцца дактары філалагічных навук А.А. Лукашанец і В.П. Русак. Пра мэтазгоднасць ужывання ў беларускай мове шмат якіх лексічных адзінак, у тым ліку і "пазаслоўнікавых", пісаў знаны мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар П. Сцяцко ў кнізе "Культура мовы" *(Мінск, 2002. 444 с.)*.

Думаецца, мэтазгодна будзе пазнаёміць чытача з "пазаслоўнікавымі" словамі, якія ўжываюцца ў празаічных творах Алеся Ветаха. У іх гэтыя словы пачуваюць сябе натуральна, паколькі ўжытыя дарэчы і таму з'яўляюцца несумненнай акрасаю ягоных твораў.

Большасць гэтых слоў словаўтваральна суадносяцца з літаратурнымі лексічнымі адзінкамі: *варажнеча* - варагаванне, варожасць: *Ад таго часу пралегла між імі мяжа раз'яднанасці, пачаліся лютая* ***варажнеча*** *і вайна*; *жахотныя* - жахлівыя: *У тыя* ***жахотныя*** *хвіліны мне жадалася хутчэй упасці на калені перад покуццю…*; *ваяр* - воін: *Сапраўдны воўк-****ваяр*** *ніколі не будзе дбаць пра слабых і ўбогіх, шкадаваць асуджаных на гібель і вымiранне*; *звязак* - сувязь: *Яна згадвалася цяпер найперш у* ***звязку*** *з тым цудоўным куточкам…*; *затэлефанаваць* - пагаварыць праз тэлефон: *З кухні Ксеня перайшла ў вітальню і* ***затэлефанавала*** *ў паліклініку, каб выклікаць доктара на дом*; *землятрус* - землетрасенне: *Перш здавалася, быццам пачаўся магутны* ***землятрус****, пра які яшчэ не так даўно Кацярына чула ў школе.*

Так, напрыклад, да нульсуфіксавых вытвораў адносяцца: *аповед* - тое, што апавядаецца: *А яшчэ пазней, як я пасталеў, дык пачуў бабулін* ***аповед*** *пра іншыя зоркі*; *спадзеў* - спадзяванне: *Яно і зразумела: нямоглы чалавек зазвычай мае таемны* ***спадзеў*** *на раптоўвае выздараўленне*. Назоўнік *заплечнік* ("рэчмяшок") утвораны конфіксавым спосабам ад асновы назоўніка *плеч-ы*: адначасовым далучэннем прыстаўкі ***за-*** і суфікса ***-нік-***: *Значыць, і мне трэба браць* ***заплечнік*** *і ісці на чыгунку, каб ехаць у горад, туды, дзе мяне чакаюць праца і клопаты. Вітальня* ("пярэдні пакой") утворана ад асновы інфінітыва *віта-ць* пры дапамозе суфікса ***-льн-***: *Сяргея таксама непакоіла самаадчуванне сына, і ён моўчкі падаўся ў* ***вітальню*** *да тэлефона, каб звязацца з Германовічам… Унёсак* ("унесеныя грошы на што-н.; узнос") словаўтваральна матывуецца дзеясловам *унес-ці* (да асновы далучаецца суфікс ***-ак-***): *Матэрыяльна дапамаглі з першым* ***унёскам*** *бацькі, асабліва яго, Мікіты, бо сума патрабавалася немалая, а Мікітаў бацька добра зарабляў, працуючы ў сферы прыватнага гандлю.*

У творах ужываюцца натуральныя формы назоўнікаў і прыметнікаў замест дзеепрыметнікавых формаў з неўласцівымі беларускай мове суфіксамі ***-ач-, -уч- (-юч-)***: *выступоўца* - той, хто выступае; прамоўца: *...якія* [людзі] *пільна ўзіраліся ў яго і, здавалася, зараз таксама паўстануць у ролі* ***выступоўцаў****…*; *вернік* - той, хто верыць у існаванне Бога: *...хутка праехалі рэшту дарогі да месца паломніцтва* ***вернікаў*** *і экскурсій цікаўнага люду*; *кіраўнічы* - які ўласцівы кіраўніку: *Буйская мела неблагія арганізацыйныя здольнасці і сякітакі досвед адміністрацыйна-****кіраўнічай*** *працы…* Параўн., напрыклад: бел. *вернік* і *веруючы (ТСБМ, т. 1, с. 480)*, *кіраўнічы* - *кіруючы (ТСБМ, т. 2, с. 689)*.

Выкарыстоўваюцца назоўнікі з суфіксамі ***-оўц-, -яр-*** (замест нехарактэрнага для беларускай мовы суфікса ***-цель***): *кіроўца* - вадзіцель, шафёр: *Уяўляючы сябе кіроўцамі, мы па чарзе з незвычайным імпэтам круцілі руль…*; *мысляр* - мысліцель: *…потым* [Іваніцкі] *уваходзіў у вобраз глыбакадумнага* ***мысляра*** *і прапаноўваў: "Давай, чалавеча, пра наша жыццёбыццё паталкуем…"*

Са сваямоўнага матэрыялу ўтворана прыслоўе *зрэдзькалі* - часам, час ад часу: *Праўдачка,* ***зрэдзькалі*** *сякія-такія госці, як у раён прыязджаюць, дык яны да нас наведваюцца…*

Некаторыя словы захавалі марфемную будову асновы, ад якой яны ўтвораныя, інакш кажучы, ужываюцца без чаргавання апошняга зычнага гэтай асновы: *грахоўны* - грэшны: *І я* ***грахоўны***; *народзіны* - нараджэнне: *- Мой дзень* ***народзінаў*** *будзе толькі ў наступным годзе, - засмучана адказаў я*; *лекаваць* - лячыць: *…і* ***лекавала*** *яго сына, клапацілася, каб ён перадужаў хваробу, выздаравеў*; *лекаванне* - дзеянне паводле значэння дзеяслова *лекаваць*: *З братам мы занялiся* ***лекаваннем*** *звярка*; *лекавацца* - лячыцца: *Цяжка хварэла і доўга* ***лекавалася****.*

Ужываюцца словы без фіналі ***-ый***, якая "супярэчыць марфалагічнай і словаўтваральнай сістэмам беларускай нацыянальнай мовы" *(П. Сцяцко)*: *Каментар* - каментарый: *…і адразу без лішніх адступленняў і* ***каментароў*** *выказаў сваю заклапочанасць…*

Аддаецца перавага больш дакладным (беларускім) назвам рэлігійных святаў, напрыклад: *Дабравесце* - Благавешчанне, звеставанне: *Набліжаўся красавік, на пачатак якога, як вядома, прыпадае* ***Дабравесце****.*

Сустракаюцца словы, якія выкарыстоўваюцца замест апісальных назваў: *звечарэлы* - такі, які ахутаны вечарам: *Здавалася, нябесная зорка-іскрынка вось-вось загарыцца яркім агеньчыкам і напоўніць святлом* ***звечарэлае*** *сутонне*; *маладзён* - малады чалавек: *А, галоўнае, дзякуючы прынцыповай пазіцыі Ніны Васільеўны, змаглі супольна адрэагаваць на абразу, пыху і хамства* ***маладзёна****…*; *напоўніцу* - на поўны рот: *Цыгарэтны дым уцягваў прагна і* ***напоўніцу***; *наступства* - тое, што з'яўляецца ў выніку чаго-н.: *І маці з бацькам, мабыць, спалохаліся пагроз, а мо проста перастрахаваліся ад магчымых* ***наступстваў***; *падпарадкаванец* - той, хто падпарадкоўваецца каму-н.: *Многія радаваліся, што зніклі панаванне і ўлада людзей, якія хто хітрасцю, а хто прынукай падпрадкоўвалі іх волю і нораў, выдрэсіроўвалі іх* [сабак] *у бездакорных падпарадкаванцаў…*; *святар* - назва служкаў рэлігійнага культу: *Айцец Андрэй - адзін з тых* ***святароў****, хто несправядліва пацярпеў і быў незаслужана пакараны*; *слухаўка* - тэлефонная трубка: *Пасля гэтых слоў у* ***слухаўцы*** *гучна запіпікала…*

Сярод слоў ёсць такія, што не толькі называюць пэўную рэалію, але і вобразна характарызуюць яе: *лецішча* - дача: *Таму, калі Даніла Грыб у чарговы раз завітаў, каб запрасіць пагасцяваць на* ***лецішчы****, пагадзіўся*. Стылёва нейтральны назоўнік словаўтваральна звязаны з словамі *лета* і *летаваць* (утвораны суфіксам ***-ішч-***).

Замест штучнага для беларускай мовы прыметніка *маладзёжны* ўжываецца ўтвораны паводле актыўнай словаўтваральнай мадэлі прыметнік *моладзевы*: *Гэтым Копаць і карыстаўся, каб паказаць у* ***моладзевай*** *аўдыторыі сваю значнасць і веліч*. Як слушна адзначае П. Сцяцко, "няма ў нас такога прыметнікавага суфікса ***-ёжн-ы***).

Выкарыстоўваецца субстантываваны дзеепрыметнік з суфіксам ***-л-*** (замест неўласцівай формы з суфіксам ***-ўш-***; *гл. ТСБМ, т. 4, с. 138*): *пацярпелы* - той, хто пацярпеў: *Яму здавалася, што з боку* ***пацярпелага*** *абавязкова будзе пэўная рэакцыя альбо нейкая спроба, але нічога падобнага не дачакаўся.*

Са значэннем "той, хто прымае ўдзел у размове" выкарыстоўваецца натуральны назоўнік *суразмоўца*: *…толькі трэба адчуваць свайго суразмоўцу ці проста маўклівага спадарожніка*.

Замест двухслоўнага назову ўжываецца аднаслоўны з выразнай марфемнай будовай: *напрыканцы* - пад канец (прыназоўнік для выражэння часавых адносін): ***Напрыканцы*** *сталавання Люпус закрануў моўнае пытанне, сказаў пра яго важнасць і значнасць…*

Як натуральнае ўспрымаецца слова *перамовы* (замест *перагаворы*): *Сюды людзі ў асноўным сыходзіліся на тэлефонныя* ***перамовы*** *са сваімі дзецьмі ці родзічамі*.

Адмысловікам да назоўніка *страсць* з'яўляецца *жарсць*: *…і кіпела непрадказальная* ***жарсць****…; Асабліва моцна распальваліся* ***жарсці****…*

Паколькі слова паўнакроўна функцыянуе ("жыве"), самавыяўляецца толькі ў кантэксце, у дадзеным выпадку - мастацкім, прывядзём яшчэ прыклады адметных слоў (без каментару іх утварэння): *зацікаўленне* - інтарэс: *У адносінах да цябе быў цвярозы разлік, карыслівыя мэты і* ***зацікаўленні****, таму ты меў справу з людзьмі-маскамі*; *кепства* - кепскае, благое: *…Жыгалаў Павел і Дубінаў Андрэй рабілі розныя* ***кепствы****, не давалі ёй* [суседцы] *спакойна жыць*; *ліставанне* - абмен лістамі, перапіска: *Пасля працягваў: - З аўтарам мы пастаянна трымалі сувязь, падключыліся да* ***ліставання*** *праз інтэрнэт*; *насамрэч* - у сапраўднасці, па праўдзе: ***Насамрэч*** *дзень той быў незвычайны: упершыню інстытут святкаваў інаўгурацыю - уступленне на пасаду новага дырэктара*; *профільны* - асноўны, вызначальны для якой-н. спецыяльнасці: *Ён наш, яго, як я казаў, рэкамендавала наша ўпраўленне, профільнае міністэрства і тры творчыя саюзы - літаратараў, кампазітараў і тэатральных крытыкаў*; *распавесці* - расказаць: *Тут дастаткова* ***распавесці*** *хаця б адну гісторыю*; *стэлефаноўвацца* - гаварылі праз тэлефон: *- Мы* ***стэлефаноўваліся*** *з Феліксам па некалькі разоў на дзень, учора сядзелі, абмяркоўвалі*; *шторанку* - штораніцы: *...****Шторанку*** *гучалі на новыя лады птушыныя спевы…*; *упраслівa* - з просьбаю: *- Жэнечка, галубка мая, - стараючыся гаварыць ціхэй і вельмі лагодна, Ляксейчыха* ***ўпраслiва*** *зірнула ў вочы маёй маці…*

Такім чынам, ужытыя ў празаічных творах Алеся Ветаха адметныя словы яшчэ раз пераканаўча сведчаць, што яны паўнавартасныя моўныя адзінкі, якія маюць усе падставы заняць годнае месца ў новым шматтомным (і аднатомным) тлумачальным слоўніку беларускай мовы, а таксама ў перакладным БРС і інш.

**Васіль Рагаўцоў.**

# Беларуская мова ў гандлёвай прасторы Беластока

Беларуская мова штораз часцей выкарыстоўваецца ў гандлёвай прасторы Беластока. У адным з рыбных рэстаранаў, які знаходзіцца ў буйным гандлёвым цэнтры горада, з'явілася меню на польскай і беларускай мовах. Гэта прыемная нечаканасць для пакупнікоў з Беларусі.

**Супрацоўніца рэстарана:**

- Мы маем вельмі шмат кліентаў з-за ўсходняй мяжы, таму робім меню па-беларуску, каб было лягчэй выбраць. Беларускае меню можа заахвоціць кліентаў прыходзіць да нас. Некаторыя, магчыма, саромеюцца падыйсці і спытаць назву стравы.







**Наведвальнікі:**

- Я не вельмі добра разумею польскую мову, таму вельмі прыемна, што палякі не забываюцца пра нас, беларусаў. Пра нас ўсюды ўжо забыліся, а палякі - не, дзякуй ім за гэта!

- Гэта вельмі добра, бо зразумела для турыстаў-беларусаў, ды і расейцаў, бо яны таксама разумеюць беларускую мову. Дзякуй, што беларуская мова ёсць у вас у Польшчы!

З увагі на шматлікасць пакупнікоў з Беларусі, уласнікі гандлёвых цэнтраў выходзяць насустрач запатрабаванням. Нікога ўжо не здзіўляюць надпісы на расейскай мове, аднак на беларускай - гэта адно з нешматлікіх выключэнняў.

***Уля Шубзда,***
*Беларускае Радыё Рацыя,*
*Беласток.*

# Адпіскі, як стыль працы чыноўнікаў усіх рангаў

Народным дэпутатам,
Старшыні Палаты Прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
Уладзіміру Паўлавічу Андрэйчанка

Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь
Андрэю Уладзіміравічу Кабякову

**ЗАЯВА.**

У Рэспубліцы Беларусь існуе негатыўнае стаўленне да развіцця роднай мовы. Адсутнічае роўнасць дзвюх дзяржаўных моваў - беларускай і рускай. Паўсюдна мова тытульнай нацыі Рэспублікі Беларусь павінна быць на першым месцы, а руская - на другім. А ў нашай краіне робіцца ўсё наадварот. Паўсюль, амаль ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, пануе руская мова.

У гарадах рэспублікі адсутнічаюць беларускамоўныя садкі і школы. Такая ж тэндэнцыя назіраецца і ў сферы адукацыі на вёсцы. Амаль паўсюль у сферы грамадскага жыцця кіраўніцтвам выканкамаў, прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў не выконваюцца, ці выконваюцца з парушэннем артыкул 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Закон Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", што з'яўляецца парушэннем правоў чапавека на карыстанне роднай моваў у нашай краіне.

Мы, удзельнікі сходу Салігорскай гарадской суполкі Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", занепакоены станам роднай мовы ў Рэспубліцы Беларусь і патрабуем:

1. Надаць, згодна з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь беларускай мове не дэкларатыўны, а сапраўдны дзяржаўны статус і ва ўсіх сферах грамадскага жыцця краіны паставіць у роўнасць дзве дзяржаўныя мовы.

2. Вырашыць пытанне аб увядзенні з боку выканаўчай улады на ўсіх узроўнях жорсткага кантролю за выкананнем артыкула 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

3. Адказ выслаць на імя Уладзіміра Генадзьевіча Масакоўскага па адрасу: 223710, г. Салігорск, вул. К. Заслонава, д. 54, кв. 18. Тэл. 8(0174)31-43-97.

Старшыня сходу Уладзімір Масакоўскі
Сакратар сходу Ніна Ярмалінская

---

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ
Пастаянная камісія па адукацыі, культуры і навуцы
220010, г. Мінск, Дом Урада, тэл./факс (017) 222-65-45, факс (017) 327-37-84
E-mail: aduk@house.gov.by

НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ПАЛАТА ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ
Постоянная комиссия по образованию, культуре и науке
220010, г. Минск, Дом Правительства, тел./факс (017) 222-65-45, факс (017) 327-37-84
E-mail: aduk@house.gov.by

9 чэрвеня 2015 г. № 20-06/138
на № ____________ от ____________

223710, г. Салігорск,
вул. К. Заслонава, 54-18,
Масакоўскаму У.Г.

Паважаны Уладзімір Генадзьевіч!

У Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы разгледжана заява ўдзельнікаў сходу Салігорскай гарадской суполкі ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны" па пытанні функцыянавання дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь.

Па сутнасці звароту мяркуем магчымым адзначыць наступнае.

У адпаведнасці з артыкуламі 17 і 50 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы, і кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін.

Дзяржава гарантуе свабоду выбару мовы выхавання і навучання, забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, праяўляе клопат аб забеспячэнні фактычнай роўнасці дзяржаўных моў. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права свабодна карыстацца іх нацыянальнай мовай, звяртацца ў дзяржаўныя органы, прадпрыемствы, установы і арганізацыі на беларускай, рускай або іншай прымальнай для бакоў мове. З мэтай рэалізацыі права грамадзян на свабоднае карыстанне дзяржаўнымі мовамі заканадаўства абавязвае кіраўнікоў, іншых работнікаў дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемстваў, установ, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў валодаць беларускай і рускай мовамі. Заканадаўствам не рэгламентуецца ўжыванне моў у неафіцыйных зносінах, у зносінах членаў працоўных калектываў паміж сабой.

Асноўным нарматыўным прававым актам у сферы заканадаўства аб мовах з'яўляецца Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 года "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 1998 года). Дадзены акт замацоўвае асновы выкарыстання моў у найбольш важных сферах жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы. Да таго ж Законам урэгуляваны пытанні развіцця і ўжывання беларускай, рускай і іншых моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі ў дзяржаўным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці, а таксама пытанні аховы правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў дадзенай сферы.

Артыкулам 6 Закона асобна замацавана норма, згодна з якой усякія прывілеі ці абмежаванні правоў асобы па моўных прыметах недапушчальныя.

Як ужо адзначалася намі вышэй, дзеючае заканадаўства не абмяжоўвае права грамадзян Рэспублікі Беларусь карыстацца той або іншай дзяржаўнай мовай, а таксама іншымі мовамі, якімі карыстаецца насельніцтва нашай краіны, і стварае для гэтага шырокія магчымасці.

Такім чынам, пытанні развіцця і ўжывання беларускай і рускай моў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама пытанні забеспячэння канстытуцыйных правоў грамадзян у моўнай сферы, на наш погляд, дастаткова поўна ўрэгуляваны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Старшыня камісіі А.І. Сягоднік.

---

АПАРАТ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
АДДЗЕЛ ПА РАБОЦЕ СА ЗВАРОТАМІ ГРАМАДЗЯН І ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ
вул. Савецкая, 9, 220010, г. Мінск
тэл. 222 60 46, факс (017) 222 60 46
E-mail: mail@government.by

АППАРАТ СОВЕТА МИНИСТРОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ОТДЕЛ ПО РАБОТЕ С ОБРАЩЕНИЯМИ ГРАЖДАН И ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ
ул. Советская, 9, 220010, г. Минск
тел. 222 60 46, факс (017) 222 60 46
E-mail: mail@government.by

28 мая 2015 г. № 15/5-М-212

Масакоўскаму У.Г.,
вул. К. Заслонава, д. 54, кв. 18,
г. Салігорск,
Салігорскі р-н,
Мінская вобласць

Ваш зварот, які паступіў у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, накіраваны для разгляду ў Міністэрства адукацыі з просьбай паведаміць Вам аб выніках.

Намеснік начальніка аддзела па рабоце са зваротамі
грамадзян і юрыдычных асоб Апарату
Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Т.Г. Майаровіч.

---

00027626

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
вул. Савецкая, 9
220010, г. Мінск
тэл. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

05.06.2015 № 05-1253-Кол-(0)-0
На № ____________ от ____________

Масакоўскаму У.Г.
вул. К. Заслонова, д.54, кв. 18,
223710, г. Салігорск

Паважаны Уладзімір Генадзьевіч!

У Міністэрстве адукацыі разгледжаны Ваш зварот, які паступіў з Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. У межах сваёй кампетэнцыі паведамляем наступнае.

Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы. Гэта замацавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Законе Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

У адпаведнасці з артыкулам 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і стварае ўмовы для рэалізацыі гэтага права. Мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі з улікам жаданняў навучэнцаў (законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў). У заяве законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў вызначаецца пажаданая мова навучання дзіцяці.

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі дзеці далучаюцца да багацця беларускай мовы, фарміруюцца каштоўнасныя адносіны да яе. Ва ўсіх узроставых групах ажыццяўляецца знаёмства з беларускімі народнымі святамі, звычаямі, творамі беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў, выхоўваецца пачуццё этнічнай прыналежнасці, фарміруюцца ўяўленні аб роднай краіне, устойлівая цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы. У розных відах дзіцячай дзейнасці развіваецца культура маўленчых зносін, фарміруецца актыўны і пасіўны слоўнік, граматычны лад маўлення, правільнае вымаўленне гукаў, дыялагічнае і маналагічнае маўленне як сродак зносін.

Вывучэнне беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пачынаецца з першага класа. У I-XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання адукацыйны працэс па ўсіх вучэбных прадметах здзяйсняецца на беларускай мове, ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання - на рускай мове.

З агульнай колькасці 3 074 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ў 2014/2015 навучальным годзе ў 1 547 здзяйсняецца адукацыйны працэс на беларускай мове, 1 523 - на рускай мове.

У адпаведнасці з Тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі беларуская мова вывучаецца з першага класа.

З 2013/2014 навучальнага года ў адпаведнасці з Метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі вывучэння асобных прадметаў на павышаным узроўні ў сярэдняй школе, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 29.03.2013 № 06-19/28, па жаданні законных прадстаўнікоў вучняў і рашэнні заснавальніка ўстановы адукацыі магчыма вывучэнне вучэбнага прадмета "Беларуская мова" на павышаным узроўні ў X, XI класах у аб'ёме трох вучэбных гадзін.

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўведзены абавязковы выпускны экзамен па беларускай і рускай мовах за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжаны выпускны экзамен па адной з дзяржаўных моў на выбар вучняў - рускай або беларускай.

Выпускнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі забяспечана права выбару тэстаў на рускай або беларускай мове пры праходжанні цэнтралізаванага тэсціравання.

Штогод 21 лютага з мэтай захавання мовы як культурнай спадчыны беларускага народа адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. У межах правядзення свята праводзяцца навуковыя канферэнцыі, Дні і Тыдні беларускай мовы, алімпіяды, конкурсы, тэматычныя выхаваўчыя гадзіны, урокі-падарожжы, лекцыі, семінары, літаратурныя гасцёўні; арганізоўваюцца выставы мастацкай літаратуры, творчыя сустрэчы дзяцей і моладзі з народнымі майстрамі, фалькларыстамі, навукоўцамі, пісьменнікамі, дзеячамі мастацтва і іншымі прадстаўнікамі беларускай культуры.

Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь праводзіцца сістэмная работа, накіраваная на далейшае паглыбленне выкарыстання беларускай мовы і яе папулярызацыі ва ўстановах адукацыі краіны.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года "Об обращениях граждан и юридических лиц" у выпадку нязгоды з адказам Вы маеце права абскардзіць яго ў суд.

Намеснік Міністра Р.С. Сідарэнка.

## 105 - я ўгодкі з дня нараджэння

# Ларысы Геніюш

*(Заканчэнне. Пачатак на ст. 1.)*

Прагучалі песні на вершы Ларысы Геніюш у выкананні Вальжыны Цярэшчанкі, а таксама дуэт Тацціны Матафонавай і Вальжыны Цярэшчанкі.





Слонімскі пісьменнік, краязнаўца і журналіст Сяргей Чыгрын узгадаў, як святкавалі сотыя ўгодкі Ларысы Геніюш, як улады не пусцілі людзей у Дом культуры і давялося чытаць вершы Геніюш проста на прыступках.

- Думаю, што мы і надалей будзем тут збірацца, а магчыма прыйдзе час, калі гэта стане сапраўдным нацыянальным святам народнай паэткі, паэткі-змагаркі, якая жыла адной Беларуссю і малілася за яе.

Гарадзенскі паэт Юрка Голуб, які сам паходзіць з Зэльвеншчыны, таксама ўзгадваў пра Ларысу Геніюш, яе сям'ю, праўда, сказаў, што даволі няпроста сёння яму пра гэта гаварыць. Узгадалася вось што:

- Пра Ларысу Геніюш можна шмат казаць, бо гэта быў чалавек пра якога нельга забыцца. Я вось гляджу на іх хату з паперці Зэльвенскай царквы, дзе мяне хрысцілі, і мне чамусці ўзгадалася тое, як яна разам з мужам, Янкам Геніюшам, прыйшлі да нас у Зэльвенскую школу на выпускны вечар, і Ларыса Антонаўна падаравала мне санеты Шэкспіра ў перакладзе Уладзіміра Дубоўкі. У мяне гэтая кніга і цяпер у бібліятэцы, як рэлікт...



Дзятлаўскаму краязнаўцу Валеру Петрыкевічу цяжка хадзіць, баляць ногі, у яго з сабой кулі. Ён кажа, што ў такі дзень пaпросту не мог не прыехаць у Зэльву, ён імкнецца рабіць гэта штогод.

- Я адчуваю і разумею, што такіх людзей, як Ларыса Геніюш, мы ўсе павінны ўшаноўваць. І я раблю гэта кожны год, заўсёды некага прывожу. Вось раней былі дзеці, унукі, а сёння прывёз жонку і маладую настаўніцу, каб аддаць даніну павагі нашай геніяльнай паэтэсе.

Завяршаў мастацку частку каля царквы лідскі бард Сяржук Чарняк.

Ад царквы ўсе арганізавана накіраваліся на могілкі дзе пахаваная Ларыса Геніюш і яе муж - Янка Геніюш. На магіле ўсклалі кветкі і запалілі зνічы. Былі разгорнуты бел-чырвона-белыя сцягі.

Памаліўся за спакой душы Ларысы і Янкі Геніюшаў айцец Іаан з Жыровічаў, больш вядомы ўсім, як слынны змагар за беларушчыну і слынны паэт Зьніч.

Пасля могілак уся сябрына сабралася на беразе Зэльвенскага вадасховішча, дзе ізноў загучалі песні на словы Ларысы Геніюш, а таксама і іншыя, у большасці патрыятычныя песні ды вершы.

Прагучалі тры версіі Паланеза Агінскага - у выкананні Вальжыны Цярэшчанкі, Тацціны Матафонавай на словы Сержука Сокалава-Воюша. Трэцюю версію - верш памерам Паланеза - прачытаў айцец Іаан (Зьніч).

Такім чынам чарговыя ўгодкі з дня народзінаў Ларысы Геніюш сталіся чарговым святам беларускага нацыянальнага духу.

Не так шмат сабралася людзей сёлета ў Зэльву, але Гарадзеншчына была прадстаўлена даволі грунтоўна: Гародня, Ліда, Слонім, Дзятлава, Масты... І трэба вялікі дзякуй сказаць Міхасю Скоблу, які штогод ахвярна шчыруе над арганізацыяй у Зэльве імпрэзаў па ўшанаванні памяці вялікай беларускі. Дзякуючы такім рупліўцам, як Міхась, не пагасне зніч памяці, не зарасце сцяжына ў Зэльву, і дух Беларушчыны будзе ўзлятаць над Зэльвай і разлятацца па-над усёй краінай.

***Паводле СМІ.***

# У магілёўскім гуртку ТБМ



6 жніўня на беларускім гуртку сябры ТБМ абмеркавалі праблемы і стан сучаснай беларускай тапанімікі. Архітэктар спадарыня Алена Асмакоўская распавяла пра асноўныя мэты і задачы тапанімікі ў жыцці любога грамадства, краіны, населенага пункту і больш падрабязна ўзняла пытанні нашых гарадскіх тапанімічных праблемаў, якія не толькі датычацца кожнага мяшканца, але і ствараюць імідж гораду ( і не заўсёды спрыяльны). Увогуле назовы гарадскіх аб'ектаў - гэта не проста паштовыя адрасы, гэта наша гісторыя, наша спадчына, культурная каштоўнасць, і таму да гэтага пытання трэба падыходзіць вельмі ўважана, прыслухоўвацца ў першую чаргу да адмысловцаў і гісторыкаў, а не прыдумляць адсябечыну з нейкіх палітычна-каньюктурных нагод.



***Аляксандр Сабалеўскі,***
*Магілёўская гарадская арганізацыя ТБМ імя Ф. Скарыны.*

Беларуская мова - ТБМ - наша будучыня

### *Ахвяраванні на ТБМ*

1. Прылішч Ірына - 50000 р., г. Менск
2. Беларускі патрыёт- 300 дол. ЗША, г. Менск
3. Бамбіза Мікола - 600000 р., г. Менск
4. Шырвель Андрэй - 70000 р., г. Менск
5. Сасонка Людміла - 200000 р., г. Менск
6. Вяргей Валянціна - 110000 р. г., Менск
7. Кукавенка Іван - 100000 р., г. Менск
8. Грышан Мікола - 50000 р., г. Мазыр
9. Несцераў Віктар - 500000 р., г. Менск
10. Шумскі Ягор - 150000 р., г. Менск
11. Восіпава Аляксандра- 100000 р., г. Гомель
12.Прыгожыны Вольга і Аркадзь - 5000 рас. руб., г. Масква
13. Шкірманкоў Фел. - 100000 р., г. Слаўгарад
14. Мяхеўка Аляксей - 30000 р., в. Цесны, Вілейскі р-н
15. Сымон Барыс - 30000 р., г. Менск
16. Бамбіза Мікола - 600000 р., г. Менск
17. Пухоўская Ю.А. - 50000 р., г. Менск
18. Чыгір Я. А. - 50000 р., г. Гродна
19. Рабека М.М. - 150000 р., г. Менск
20. Прылішч Ірына - 50000 р., г. Менск
21. Кухаронак А. Д. - 50000 р., г. Смілавічы, Чэрвенскі р-н
22. Анікееў Міхаіл - 200000 р., г. Менск
23. Лягушаў Алег - 100000 р., ст. Ясень, Асіповіцкі р-н
24. Ляўшун Дзяніс - 190000 р., г. Менск
25. Касяк Канстанцін - 30000 р., г. Менск

Дзейнасць ГА "ТБМ імя Францішка Скарыны" па наданні роднай мове рэальнага статусу дзяржаўнай вымагае вялікіх выдаткаў. Падтрымаць ТБМ – справа гонару кожнага грамадзяніна краіны.

Просім Вашыя ахвяраванні дасылаць на адрас, вул. Румянцава, 13, г. Мінск, 220034, альбо пералічыць на разліковы рахунак ТБМ №3015741233011 у Аддзяленні № 539 ААТ "Белінвестбанка" код 739 (УНП 100129705) праз любое аддзяленне ашчадбанка Беларусбанк.

**Паведамленне**

**Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705**
атрымальнік плацяжу
**Аддзяленне № 539 ААТ "Белінвестбанк"**
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015741233011** Асабовы рахунак **739**

(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

| Від плацяжу | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраванні | на дзейнасць | | | |
| ТБМ | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Пеня
Разам

**Касір**

Плацельшчык

**Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" УНП 100129705**
атрымальнік плацяжу
**Аддзяленне № 539 ААТ "Белінвестбанк"**
назва банка
Рахунак атрымальніка **3015741233011** Асабовы рахунак **739**

(прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас)

| Від плацяжу | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраванні | на дзейнасць | | | |
| ТБМ | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Пеня
Разам

**Квітанцыя**

**Касір** **М.П.**

Плацельшчык





# Цікава пра літаратурнае жыццё

Кнігу **"Сучаснае беларускае літаратурнае жыццё"**, *2015, 280 стар., 99 экз.*, не абыдзе ўвагаю ніводзін знаны ў літаратуры чытач. Бо ніколі не знікне ў грамадстве цікавасць да культуры і асветы, медыцыны, літаратуры і спорту.

Так мне думаецца. Аўтар Валер Санько гаворыць пра колішнія і цяперашнія адносіны да творчасці пісьменніка ў рэдакцыйных калектывах. Тэксты абедзвюх частак кнігі падкупляюць пранізлівай праўдзівасцю. Такой кнігі ў Беларусі не было.

Нестандартная кніга змушвае пачаць яе ацэнку таксама нестандартна.

Спярша поўнасцю прывяду анатацыю і пасляслоўе.

**Анатацыя** *(стар. 2)*: *Упершыню доказна і аргументавана гаворыцца пра парадкі/непарадкі ў беларускіх рэдакцыйных калектывах, у тых самых, якія зачастую любяць крытыкаваць іншых, вучыць, маралізаваць. Не крытыкуюцца палітычныя партыі, эканамічныя і сацыяльныя праблемы Беларусі, Адміністрацыя Прэзідэнта.*

*Першая частка кнігі - параўнальна нядаўняя перапіска пісьменніка з рэдакцыямі - паказвае праўду/няпраўду абодвух бакоў, другая частка высвечвае годнасць аўтарскіх твораў, справядлівасць/несправядлівасць узаемных ацэнак (прыдзірак, апраўданняў). Размова тычыцца дзяржаўных і недзяржаўных выданняў, рэспубліканскіх і раённых. Зачэплівае апошнія гады, хаця 50-гадовыя ўціскі дазваляюць В.А. Санько весці размову значна шырэй.*

*Знаёмства з паддывановымі рэдакцыйнымі гульнямі, даўнейшымі і цяперашнімі парадкамі на беларускіх літаратурных і газетных гонях зацікавіць філолагаў, вопытных і маладых журналістаў, пісьменнікаў.*

**Пасляслоўе Анатоля Грыцкевіча:** ***Так не можа быць. Але так было, ёсць*** (стар. 275-278).

*"Даўнавата я хварэю. Цісnуць гады ўсё мацней. Чытаю дакументы і кніжкі толькі крайне неабходныя для ўласнай працы.*

*Чужыя тэксты, кнігі не чытаю, нават не прагледваю. Выключэнні рэдкія. На рукапіс Валера Санько "Беларускае літаратурнае самаедства", 278 стар., не магу адазвацца падрабязным аналізам, вялікай рэцэнзіяй.*

*Яго сумненні - ці варта выносіць на вочы любога чытача дзесяцігоддзямі твораную беларускую літаратурную нізасць - я катэгарычна адрынуў. Неабходна. Чытаеш перапіску паміж В.А. Санько і рэдакцыямі, поўную гора, бюракратычных вывертаў, намёкаў, узаемнай з'едлівасці - і асяляецца ў душы лагічны вывад. Так не можа быць.*

*Пры усёй павазе да земляка і працалюба закрадвалася і такое: у рэдакцыі Санько прадстаўляў творы слабыя, а то і наўпрост нікчэмныя. Доказнасць яго цяперашніх крыўдаў не мае рэальнай асновы.*

*Так падумвалася. Аднак пасля часопісна-газетных узгадкаў пра лёс твора (у асноўным аргументоўнічае В. А. Санько) ў "Адхіленых творах" знаёмішся з разгляданым тэкстам, плюсамі мінусамі сюжэту, характарыстыкамі герояў, моваю аўтара і адразу пераконваешся: мякка піша Валер Санько пра беларускае літаратурнае самаедства, надта далікатнічае.*

*Яму нельга было цярпець футбольную беларускую літаратурную нізоту пяцьдзясят гадоў. Даўно патрэбна было расказаць пра гэта народу. Толькі святло праўды выжане цемру невытлумачальнай з'едлівай прадузятасці і неасветнасці з нашых рэдакцыйных падвалаў, закуткоў. Усеагульны паказ злыбедстваў В.А. Санько паможа не дапусціць такога з маладымі расткамі. Яны стануць хутчэй прабівацца на шырокі прасцяг.*

*...Перапіску чытаю і не веру вачам. Так не павінна быць. Але так было, на жаль, ёсць.*

*Не раз аналізуюцца ў краіне справы ў сельскай гаспадарцы, медыцыне, навуцы, міліцыі... З глыбокай крытычнасцю літаратурныя пытанні практычна не зачэпліваліся. Калі што і кратаецца, то бегла, адзінкава - часопіс, твор, артыкул.*

*Для эканоміі часу і нерваў прыводжу невялічкія адрыўкі з маіх прадмовы і заключэння да двух кніг В. Санько.*

***Кніга "Усё скончана: мы прайшлі па Маскве"**, 1993:*

*На Беларусі няшмат твораў гістарычнай тэматыкі. Асабліва ў параўнанні з літаратураю народаў-суседзяў. Таму асабліва прыемна чыталася аповесць Валера Санько "Усё скончана: мы прайшлі па Маскве" (яна не надрукавана ні ў адным дзяржаўным выдавецтве).*

*Ствараецца ўражанне, аўтар сапраўды таемнымі пуцявінамі ўведаў штосьці значнае з касмічных ведаў, калі расказвае, як задоўга да вайны прафесар Карл Гаўсгофер папярэджваў Адольфа Гітлера аб праходзе нямецкіх войск па Маскве. Сюжэты ў аўтара не проста займальныя, яны выварочваюць, перакаўмлычваюць душу, прымушаюць сцінацца ад таямніцаў, што вітаюць вакол нас.*

*...Вопыт празаіка і рэдактара (аўтар доўгі час загадваў рэдакцыямі ў выдавецтвах) дапамог яму выйсці на рэдкую містычна-гістарычную тэму. Мажліва, яму варта ад гістарычнай фантастыкі, аздобленай выключна праўдзівымі канкрэтнымі дэталямі, не ўхіляцца і надалей. Тады лягчэйшы шлях будзе ягоных твораў.*

***Кніга "Грэх на іх нязмыўны"**, 2013:*




*Прыцягваюць у аповесці-ўяве глыбінныя філасофскія разважанні, гістарычная дакументальная фактура, бадай, упершыню шырокаададзеная ў невялікім мастацкім творы (146 стар.).*

*Справядлівы паказ мастаком адчуванняў усіх слаёў грамадства, як у рамане **"Звіняць жаўрукі ў Чарнобыльскім небе"**, радство перажыванняў герояў яднаюць беларуса і рускага, паляка і немца.*

*... Гісторыя хлусні, выдумак, замоўчванняў вакол гібелі Янкі Купалы не мае лагічнага канца. Угадаў аўтар ці выведаў у нябесных таемных сіл, прадбачыў ці, як Роберт Конквест, даследчыцкі прыйшоў да падрабязнай дэталізацыі падзеяў у аповесці - неістотна. Галоўнае, поўная сілы празорная праўдзівасць. Адчуванні душы чалавека (хоць і выключна грэшнага) на Тым свеце наогул ніколі нікому не былі дасяжныя, нікім не апісваліся, тым болей так яўна, доказна.*

*Творчасць аўтара рэльефная, цэльная, самабытная, вялікай энергіі. Я пісаў пра гэта ва ўводзінах да яго кнігі "Усё скончана: мы прайшлі па Маскве" (1993), з радаснай упэўненасцю паўтараю цяпер. Магутная заклікальнасць праўдзівасці, заглыбленая філасофскасць, моўныя знаходкі Валера Санько ўзраслі ў аповесці.*

*Абавязаны прывесці яшчэ адну думку - з заключэння пісьменніка і доктара філалагічных навук Алеся Яскевіча ў кнізе В. Санько **"Не плач, маці"**, 1995:*

*Ён (аўтар) даўно зразумеў свае хібы. Прапалвае, а то і дапаўняе былыя тэксты, друкаваныя і недрукаваныя. Часам мне прыходзіць крамольная думка: яму не крыўдаваць патрэбна на прыкарытнікаў (ягоная тэрміналогія, так загневаны кажа пра многіх супрацоўнікаў часопісаў, выдавецтваў), а дзякаваць ім... Браце-коце, не сярдуй на бюракратную літаратурную беларускую сістэму і тупых яе сыноў. Так, білі цябе па-дурному і несправядліва, на палях тваіх твораў пісалі дурноцце, - але яны памаглі табе зараз не сарамаціцца слабізною надрукаваных кніжкаў. Памаглі паўстаць перад цяперашнім раздураным і адначасова патрабавальным чытачом пісьменнікам чысценькім, не замазаным згодніцтвам, выдыганнем перад сістэмаю.*

*Пакутнік-недрукаванец, свядомы і несвядомы змагар з прыкарытнікамі ад літаратуры няхай дзякуе Богу і жыццю.*

*...Чытаеш творы ў другой частцы дадзенай кнігі і паўстае пытанне: "Чаго вы хочаце, паньства?" Мяркую, яно ўзнікае ў кожнага чытача, хоць трохі знаёмага з беларускаю "цудоўнаю літаратураю, яшчэ вышэйшай крытыкай".*

*Правільна робіць пісьменнік Санько, калі паказвае беларускую рэдакцыйную слабасць, вышыню, нізасць. Даўно пара. Годзі хваліцца, пускаць бурбалкі.*

*У рэдакцыях абавязаны не адвяргаць, а дапамагаць старому і маладому. У нас наадварот. Чытайце главу "Каму молімся"! Досыць пагульвацца ў значнасць, велічыню і таўшчыню.*

*Жыццё любога чалавека - боль, у творчага ў дадатак - шчырасць агалення душы і духу. Крыўдна за беларускую літаратурную структуру, дзяржаўную і незалежную, калі яе прадстаўнікі па асобнасці і ў цэлым гадамі не разумеюць, не прымаюць навізну і нестандарт Валера Санько.*

*Чаго болей у жвавай плыні адхіленняў - злосці, дробнатварнасці ці элементарнай зайздроснай тупасці... - вызначыць не магу. Перачытваць тэкст кнігі другі раз, каб вызначыцца з канкрэтыкай ацэнкі, няма здароўя, сілы. Няхай гэта зробіць чытач, спадзяюся не на добразычлівага і лагоднага чытача - на аб'ектыўнага, праўдзівага. Крытыкі будуць шукаць у суцэльных замоўчваннях і адпісках цяпло і сардэчнасць, узважанасць ацэнак, жаданне дапамагчы беларускай літаратуры і аднаму з бядачных яе творцаў. Не знойдуць. Так мне думаецца.*

*Правільна піша Санько: ні ў адной дзяржаве няма, не можа быць кіраўніком Саюза літаратурных арганізацыяў пісьменнік, які піша на мове чужой нацыі. На Беларусі ёсць.*

*Гэта норма? усе сляпыя? такі кіраўнік ўцішыць боль пісьменніка-патрыёта? стане разбірацца ў яго праблемах? Нізашта. Не здолее, ды яго і не паслухаюць.*

*У якой бы мантыі рускамоўны пісьменнік Мікалай Чаргінец не хадзіў, генеральскай ці сенатарскай, яго слова для рэдактара часопіса, выдавецтва не будзе істотным. Як і слова Алеся Карлюкевіча.*

*...Даўнавата я моцна хварэю. Цісnуць гады, моцна. Дэталёва разбіраць кнігу В. А. Санько не магу. Выказаў асноўнае. Спадзяюся, трэцяя мая рэцэнзія на яго чарговую нечаканую кнігу будзе станоўчай для яго і дзяржавы.*

***Анатоль Грыцкевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар. Снежань, 2014."*

Я, рэцэнзент, думаю, правільна зрабіў аўтар, калі замяніў назву кнігі на "Сучаснае беларускае літаратурнае жыццё". Яна суцішная, меней кідкая, чым "Беларускае літаратурнае самаедства". Хаця практычна сэнс не мяняе.

Хоць бы не хацеў, не магу абысціся без цытавання асобных урыўкаў з першай часткі. Яны красамоўныя, жыццёва яркія. Звязваць адзін адрывак з другім не буду, не бачу сэнсу.

**Стар. 3-4:**

*"Перакананы, ва ўсіх газетах і часопісах, радыё і тэлестудыях, выдавецтвах працуюць старанныя талковыя спецыялісты. Усе хочуць, каб іх выданне, перадача, кніга прыносілі карысць народу, аўтарытэтнічалася ў маладых і старых чытачоў, слухачоў.*

*Браткоў-журналістаў і пісьменнікаў бараніў я заўжды. Ні адно выданне ці рэдкалектыў не закранаў раней, не хачу пакрыўдзіць цяпер. Нападкам на рэдакцыі даваў адпор.*

*Нават у справядліва (на мой погляд) і несправядліва (на іншы погляд) раскрытыкаваных цяпер рэдакцыйных калектывах, думаю, ёсць нямала станоўчага.*

*Размова ў кнізе ў асноўным пойдзе пра местачковасць літаратурнага мыслення ў рэспубліканскіх літаратурных выданнях, іх прадузятасць, закасцянеласць. Замест дапамогі аўтару ў літустановах і газетах адкрытым і закамуфляваным патокам ідзе суцэльнае цэнзарства, "асадзі назад", шэрасць, усярэдненасць.*

*Пяцьдзясят чатыры гады зведанага літаратурнага ўціску дазваляюць мне так сцвярджаць.*

*Як араты і вадзіцель мэтанакіравана ці бессвядома перадаюць вопыт падлетку, так паэт і мастак, пісьменнік вучыць дарослых. Прынамсі павінны вучыць. Атрымліваецца не заўжды, не ва ўсіх.*

*Мноства люду жыве ў спакойнай паспяховасці працы і бытавання. Асабліва чуюцца такімі высокапрафесійныя інтэлігенты, хаця зачастую менавіта яны элементарныя верхагляды, нават у непасрэднай прафесіі. Разумныя з такіх усведамляюць немажлівасць пастаяннага настаўніцтва і аб'ектывізму, абмежаваныя і зашораныя - не. Надта прыкра, калі верхаглядная звужанасць распаўсюджана сярод так званых настаўнікаў жыцця - філосафаў, пісьменнікаў, адміністратараў. Тлумачэнне простае, хітрулеціць у прафесіі знаўцу лёгка, як маніць адвечнаму круцялю.*

*Хібы пісьменніцкай павярхоўнасці грамадствам найменей заўважныя, хаця яны найболей агідныя, бо рабацяга і медык, настаўнік і школьнік вераць напісанаму, прамоўленаму пасаднымі ўмекамі і старраннікамі.*

*Незадаволеныя сабою і ваколлем святыя і вялікія творцы, у чым бы іх творчасць не выяўлялася, а сярод цяперашніх прыдзяржаўленых пісьменнікаў Беларусі вельмі часта - усё хакей, цёпла, добра, уежна. Дзяржава звыклася з іх павярхоўнасцю, значыць ёй патрабуецца менавіта такая шэрасць, выгадна недалёкасць і самазахвальванне.*

*Аб'ектыўным паказам быцця пісьменнік, калі ён стваральнік, абавязаны вучыць чытача, якую б пасаду той не займаў. Большасць беларускіх пісьменнікаў, думаецца, застылі на этапе фатаграфавання, павярхоўнага маралізатарства.*

*Што карысна, неабходна токару і медсястры з цяперашняй беларускай літаратуры, без чаго ў сённяшнім прыгожым пісьменніцтве яны не змогуць абысціся, якія беларускія кнігі запатрабуюць у штодзённы ўжытак? Такія кнігі напералік. Слізгатня па тэме, а не распрацоўка яе не прывабіць кніжніка, тым болей трывала занятага ў кругаверці існавання чытача.*

*Пра такое не раз гаварыў я разумным беларускім літсядзельцам вусна і пісьмова. Асобныя крыкі душы прыведзены тут. Пісьмова іх атрымалі ў рэдакцыях. Ніхто не мог запратэставаць на праўду маіх мяккіх/завышаных ацэнак беларускага літаратурнага самаедства раней (кніга "Ненадрукаванае. У белдзяржлітструктурах", 2009). На пазнейшыя мае творы і звароты ў рэдакцыях таксама нуль увагі."*



**Стар. 5-8:**

*“Як дзеці з прагі быць пачутымі перакрыкваюцца адзін з адным, так занадта часта стварае ўражанне поўнакроўнасці і рознафарбнасці цяперашняе беларускае пісьменніцкае брацтва: пахвальвае, інфармуе, зрэдзь крытыкуе..., каб саміх пахвальвалі, даравалі. Такія не церпяць найменшую з імі нязгоду, выпытнасць. Крытыку прымаюць ўдазаваную.*

*На пытанні "Чаму такая праўка? Навошта мяняць правільнае на правільнае?" адказу ад іх няма. На просценькі запыт зрэдзь дадуць спасылку на статут, распараджэнне міністра (правілы саюзнай дзяржавы). Ты ім пра неба і грэх, яны - пра воблакі, туман. Ці адмоўчваюцца. Што іх чакае кара, як любых круцялёў і нязнакаў, не трывожыць. Не ведаюць, не задумваюцца; калі тое напаткае.*

*Элементарныя пытанні этыкі і маралі самыя разумныя з літустаноўнікаў (не ў адной Беларусі) часта зводзяць да Бібліі. Вышэй не паднімаюцца. Заўвагі да такіх - яны самі павінны значыць грамадства, вышыніць/нізіць яго шляхі - выклікаюць прастрацыю. Дзяржаўныя фактографы і прырэдакцыйныя знаўцы і дасведнікі, пры якіх бы высокіх сталах і столях не сядзелі, такое не асягаюць. Сярдуюць за нязгоду з іхнімі аднастайнымі ацэнкамі з'явы, чалавека, твора. Доказніцца не могуць - часцей адмоўчваюцца, балазе цяперашняя ўнармаванасць дазваляе абыякаўнічаць да ваколля і вакольных.*

*Асабліва не прымаюцца зашоранымі дыялекты, новае нечаканае слова. У кожным маім тэксце яны правяцца, выпалваюцца, імі папракаюць аўтара.*

*Нібы забылі выпакутаванае беларускай навукай і практыкай наступнае, класна зсумаванае ў "Вялікім слоўніку беларускай мовы: Арфаграфія, акцэнтуацыя, парадыгматыка" таленавітым Фёдарам Антонавічам Піскуновым* (Мінск, "Зміцер Колас", 2012, 1262 стар.).

**Аб'ектыўка:**

...Ад такой нармалізацыі, якая ўрэшце абярнулася муміфікацыяй, блакаваннем натуральнага доступу мовы, надта вялікія страты зазнала сфера навукова-тэхнічнай і грамадска-палітычнай камунікацыі, дзе заўжды патрэбныя адэкватныя і асабліва дакладныя лексічныя сродкі, пільная ўвага да зменаў.

Да такога вартага жалю становішча дадаліся яшчэ палітычныя і суб'ектыўныя заміны ва ўжыванні роднай мовы, якія прывялі да яе без мала поўнага выштурхоўвання з народнага жыцця. Канстатацыяй гэтых глыбокіх разбуральных працэсаў стала занясенне арганізацыяй ЮНЕСКА беларускай мовы ў групу моваў, што стаяць пад пагрозай знікнення *(Атлас "Мовы свету ў небяспецы". ЮНЕСКА. 2009).*

...Для роднай мовы настаў час не выключаць "са свайго арсеналу ўсё непатрэбнае, што раней служыла для адлюстравання жывых рэалій, а пасля знікнення іх з жыцця страціла сэнс" *(Слоўнік беларускай мовы. Пад рэд. М. Бірылы. - Мн., 1987, стар. 3)*, і не забараняць ці абмяжоўваць "пранікненне ў мову непатрэбных паралельных сродкаў" (*тамсама*), што фактычна азначае навязванне суб'ектыўных поглядаў пэўных кадыфікатараў-аўтарытэтаў і штучна стрымлівае развіццё роднай мовы, нішчыць яе адметнасць і сінанімічна-вобразную разнастайнасць.

...У сучасным беларускім маўленчым узусе рэгіянальныя народна-гутарковыя формы практычна спынілі існаванне, страціўшы сваіх носьбітаў пад прэсам маштабных працэсаў міграцыі і ўрбанізацыі, паўсюднага ўкаранення гранічна зрусіфікаваных формаў змешанага маўлення.

...Асаблівы акцэнт надаецца адлюстраванню слоў фальклорна-этнаграфічнага складу, якія характарызавалі лад жыцця беларускага народа, яго гаспадарчую дзейнасць, абрады, вераванні. Большая частка такіх слоў раней не падавалася ў слоўніках універсальнага тыпу.

*(Ф.А. Піскуноў. Вялікі слоўнік беларускай мовы..., стар. III, V, VI, VII.)*

*Як паказваюць пасылкі маіх гарэтных твораў на прачытку рэдталентам, у іх выклікае незадаволю не твор і не аўтар, а турбота - што ён хоча, чаго дабіваецца. Мы ведаем беларускую абмежаванасць і слабасць, ён ведае, што Саньку тлумачыць. Нас саміх мала друкуюць, слухаюць, прапагандуюць.*

*У Беларусі на 01.01. 2015 зарэгістравана 1577 друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Рускамоўных 684, беларускамоўных 33, друкуюць матэрыялы на рускай і беларускай - 649.*

*Заснавальнікі вырашалі выбар мовы сваіх СМІ. Інакай не выпадала. Яны маленькія, невінаваценькія, толечы ўзбіваліся на ногі і грошы, пра якую там беларускасць думаць, абы выжыць...*

*Вось і атрымалася, у раўнапраўнай двухмоўнай дзяржаве на асноваўтваральнай мове нацыі, на беларускай - усяго 33 выданні, 2,09%. Два і адна дзясятая працэнта! Скажыце каму пра такое раўнапраўства - доўга смяяцца будуць, і плявацца.*

*Няправільныя падлікі, няправільныя, тут жа запярэчаць. Астатнія не рускамоўныя, такіх усяго 684. Яны не ў 49 разоў перавышаюць беларускамоўныя, а ў 20,71 разоў.*

*Вось цяпер дакладныя падлікі, рускамоўныя перавышаюць беларускамоўныя... усяго у 21 раз.*

*Жахлівая няроўнасць!*

*Які з рускамоўных калектываў у дзяржаве Беларусь хоць раз устурбаваўся ад такой роўнасці? Не ведаю такіх.*

*А часопісна-газетныя беларускамоўныя ўсхваляваліся ад такой роўнасці? Не ведаю я такіх. Тэма закратвалася на ўзроўні ахаў, пажаданняў, а хто з іх афіцыйна ставіў пытанне перад афіцыйнымі? Не чуў я пра такія рэдкалектывы, не чуў.”*

**Стар. 58:**

*“Як сведчаць былыя і цяперашнія тэлефанаванні і пісьмы ў рэдакцыі, тры мае звароты да старшыні і генерала СПБ Мікалая Чаргінца, постукі ў іхнія дзверы бескарысныя. Людзі паўссядаліся на дзяржаўныя зарплаты, поўнасцю свой абавязак не выконваюць. Няславяць дзяржаву Беларусь перад маладымі аўтарамі і вопытнымі.*

*Ніякім членам рэдкалегій творы не аддавалі на прагляд, прынамсі мне копій іх рэцэнзій не далі. А я прасіў. У заказных пісьмах. Наогул, пісьмовага заключэння ні ад адной рэдакцыі ў мяне дасюль няма. Не лічыць жа такім разборам-заключэннем электронную пісулю Бадака.*

*Савецкія і цяперашнія ДАСТы для беларускіх рэдакцыйных літумельцаў не існуюць ці што. Вераемна, мяркуюць, пра іх ціхае ачамуральскае "ўмельства" ніхто не будзе ведаць.*

*Памыліліся. Мне агорчла беларускае літаратурнае самаедства, абыякаўства, прыдзіры.”*

**Стар. 9-10:**

*“З мною могуць не згаджацца, крытыкаваць, адвяргаць, даказваць уласную праўду і логіку здатнікі на старонках любых выданняў. Толькі дазволіце пасля мне на вашых жа старонках надрукаваць маю праўду, доказы, аргументаваць Вашы і мае ўзаемныя памылкі, свядомыя ці несвядомыя. Дазволіце самі. Вашы аргументы пяцьдзясят гадоў я слухаю, паслухаеце цяпер мае.*

*Не баюся вашай аб'ектыўнай/неаб'ектыўнай крытыкі на паласе, аднак вы, калі з нечым доказна не згаджуся, надрукуеце маю нязгоду з вашай крытыкай. У тым жа выданні. У тэрмін, вызначаны калегіяльна вамі, мною. Ці судом.*

*Так гаворыць закон. Не ваш ці мой - нашай дзяржавы, аднолькава дарагой вам і мне, аўтарскае права беларускае і міжнароднае.”*

Чытаць просьбы (даты стаяць) В. Санько ў рэдкалектывы горычна. Яшчэ маркотней знаёміцца з высновамі аўтара на рэагаванні на іх, у асноўным адмоўчванні дзяржлітстаранцаў (яго лексіка). Дзівіць футбольства і абсалютнае абыякаўства кіраўнікоў да літаратурных справаў у дзяржаве. У адпісках, замоўчваннях скразнячыць адно - сённяшнасць, прыдзірства, нежаданне думаць пра той народ, які яны афіцыйна любяць, абавязаны памагаць.

Падумаць толькі, прыкметаўска-фаталістычнае апавяданне (скарачалася да 5 стар.) пра грэх самазабойства, яно захоўвае жыцці людзей, за пяць гадоў не надрукавала ніводнае дзяржаўнае выданне. 44 (!) разы "Самазабойства - грэх апраметны" адхілілі дзяржаўныя і недзяржаўныя рэдакцыйныя таленты. Так пазначана на стар. 126, хаця, па словах аўтара, практычна адхілялі болей. У яго ўсё запісана. Доктару народнай медыцыны з нябесных высяў, кніжных схронаў, ад ведуноў і проста жыццёва дасведчаных людзей удалося сабраць абярэжныя прыкметы, удала згрупаваць, а ратоўна-абярэжны фаталізм у рэдакцыях не патрэбны.

Амаль тры тысячы чалавек за год самазабойнічае ў Беларусі, робяць спробу на такое дурноцце (у Расіі звыш пяцідзесяці тысяч), а ў высокаасветных рэспубліканскіх выданнях гэта на дзясятым месцы. Абласныя, так-так, і абласныя, асобныя раённыя, кшталту "Слуцкі край", "Маладзечанская газета", "Прынёманскія весці", таксама не трывожыць бяда і згубная накіраванасць мажлівых самазабойцаў. Што іх цісне - тэма, аўтар, слова, памер апавядання, абыякаўства - выказаць не могуць.

Не пакінуць абыякавымі стасункі аўтара з часопісамі "Полымя", "Дзеяслоў", "Маладосць", "Беларуская думка", "Нёман".

Узгадваць пра дачыненні аўтара з газетамі "Літаратура і Мастацтва", "СБ-Беларусь сегодня", "Звязда", "Наша Ніва", "Женская газета", "Тайны души", "СН-плюс. Свабодныя навіны плюс", "Рэспубліка", "Народная газета", гомельскімі рэдакцыямі... (стар. 61-116) не проста цікава - павучальна. І горка.

Як бы ні было магнітна знаёміцца з беларускім літаратурным самаедствам, упершыню так шчыра выплаканым аўтарам, самае значнае ў таленавітай смелай кніжцы - літаратурныя творы, змешчаныя ў другой частцы (стар. 116 - 273). Чытаць іх захапляльна, карысна сталаму і маладому.

Крыўда пасяляецца ў сэрцы, калі чытаеш артыкул "Не трэба байкі пра цяжкасці з ажыўленнем мовы" (стар. 242-246). У ім яскрава паказана, як няшчасную беларускую мову стагоддзямі гнялі беларусы, рускія, палякі, ні разу не памаглі ёй каталіцызм, праваслаўе, юдаізм, мусульманства.

У яго канцы закурсіўлена: *"За пяць гадоў поўны і скарочаны варыянты найважнага для гарэтнай беларускай мовы артыкула 12 разоў аўтар пасылаў у рэдакцыі. Нідзе не надрукавалі. Усе рэдакцыі ў Беларусі аб'ектыўныя, смелыя, усе за народ і мову беларускую, а надрукаваць... ім усё нешта муляе, не дазваляе"* (с. 246).

Цытаваць В. Санько болей не магу. Варта было б азнаёміць чытачоў з характэрнымі раздзеламі з першай часткі кнігі - пра ўзаемаадносіны аўтара з часопісамі "Полымя" ці "Дзеяслоў", "Маладосць" ці "Беларуская думка", газетамі. З беглага агляду-рэцэнзіі чытач не ўбачыць "справядлівасць" абодвух бакоў - рэдкалектываў і аўтара, - не зможа ацаніць горкую яву сучаснага беларускага літаратурнага жыцця.

***Анатоль Валахановіч, пісьменнік.***

*Міхал Шымелевіч*

# Алхімік з Шайбакполя

Тэадор Нарбут, аўтар “Гісторыі літоўскага народа” ў Pomniejszych Pismach Historycznych (Wilno, 1856. S. 165-170.) апублікаваў некаторыя факты з жыцця віленскага біскупа Андрэя Васілы, узятыя з невядомага рукапісу невядомага аўтара XVII ст. Рукапіс гэты ён атрымаў ад *"пана Якімовіча, які трымаў маёнтак па францішканах Шайбакоўскага кляштара ў Лідскім павеце і жыў у саміх кляштарных пабудовах, дзе і знайшоў, як ён сам казаў "завалы старых папераў, ад рукі напісаных"*. У сваёй кнізе гісторык Літвы пераказвае цікавосткі з жыцця пана Якімовіча як алхіміка, які я дазволю сабе тут перадрукаваць:

*"Ён (Якімовіч) пасля закрыцця кляштара Францішканаў у Шайбакполі Лідскага павета, атрымаў у валоданне ад скарбу фальварак з сялянамі і гаспадарскія пабудовы былога кляштара, дзе і жыў. Падобна, што рамантуючы будынкі, ён знайшоў на кляштарным паддашшу, заваленыя рознай непатрэбнай мэбляй, старыя паперы і стосы друкаваных кніг. Кнігі і паперы былі ўжо збуцвелыя і паедзеныя мышамі. З гэтых крыніц і быў напісаны біяграфічны нарыс біскупа. Так сама быў там збор рэцэптаў і сакрэтаў алхімічных, але гаспадар мне іх не паказваў. Згодна з нейкім рэцэптам (Якімовіч) хацеў зрабіць нейкі бальзам. Для гэтага, як патрабаваў рэцэпт, ён знайшоў цнатлівую дзяўчыну ва ўзросце 18 гадоў. Уважліва вывучыўшы паперы, алхімік развёў агонь у пустых склепах пад былым касцёлам, пры гэтым агні прыставіў флягу ці шкляную колбу, а сам разам з дзяўчынай раздзеліся да гала і пільнавалі начынне колбы, якое складалася з гаручых матэрыялаў. Хутка колба лопнула, адбыўся моцны выбух агню, ад чаго сам алхімік і дзяўчына атрымалі апёкі, ад якіх хутка памерлі. Гэта было ў 1837 г. Якімовіч у гэты час меў 35 ці 37 гадоў узросту.”*

Шайбакполе, маёнтак і вёска ў Васілішскай гміне, за 20 км на поўнач ад мястэчка Шчучын. Згодна з традыцыяй, Шайбакполе быццам бы было аддадзена Альгердам (але не Альгерд а Кейстут валодаў гэтай часткай краю) нейкаму Сумілу, нашчадкі якога атрымалі прозвішча "Шайбакоўскія", і апошняя з гэтага роду Зоф’я Шайбакоўская, як пасаг, прынесла Шайбакполе у дом Александровічаў пасля шлюбу з Юрыем Александровічам у 1530 г. *(Narbutt. Krotki rys dziejow litew., S. 74.)*. Згодна з Попісам войска літоўскага ў 1567 г. ў харунжастве Астрынскім удава Юрыя Александровіча з маёнтка Шайбакполе выстаўляла 2 кані, з Лычкава, Верцялкоўшчыны і Балтрамееўшчыны па 1 кані, разам 5 коней *(РГБ. Т. 33. С. 792.)*. Александровічы валодалі Шайбакполем 270 гадоў. Тарэса Александровіч 15 лістапада 1801 г. запісала Шайбакполе свайму мужу, харунжаму Яну Расудоўскаму. Пасля іх маёнткам валодаў Мірон Расудоўскі. У 1878 г. маёнтак Шайбакполе набыў з аўкцыёну падпалкоўнік Фама Ціханавіч Кандраценка. Згодна з рэвізіей 1826 г. да Шайбакполя разам з маёнткам Нявіша належалі вёскі з падданымі: Шайбакполе, Краснае, Русачкі, Карэвічы, Шляхтоўшчына, Вінтаўшчына і Хадэлі, разам 26 дымоў, 202 душы.

Уладальнік Шайбакполя Лукаш Александровіч у 1737 г. фундаваў францішканскі драўляны кляштар з драўляным касцёлам пад тытулам Св. Бенедыкта. Казімір Александровіч, падчашы Лідскі, тастамантам ад 5 чэрвеня 1754 г. запісаў францішканам ў Шайбакполі лугі "Драцілішкі" на рацэ Дзітва (можа Лебядзе?) і загадаў сваім нашчадкам пабудаваць капліцу ў маёнтку Пеляса, якую як філію ахвяраваў тым жа францішканам. Згодна з люстрацыяй 1796 г. францішкане-шайбакпольцы атрымалі фундушовы фальварак Старадворцы з вёскай у 7 дымоў. У 1825 г. Шайбакпольскі канфент меў склад: гвардыян кс. Базыль Рудзкі, канцыанатар кс. Лукаш Невяроўскі, Тамаш Шалевіч, манахі - Андрыян Невяроўскі, Тамаш Шалевіч, Антон Вітвіцкі і клерык Венцаслаў Ілгевіч. Кляштар быў скасаваны ў 1832 г., а яго фундуш перададзены ў дзяржаўны скарб.

Той жа Тэадор Нарбут у *T. IV. C. 96-98 Dziejow Narody Litewskiego (Wilmo, 1838.)* быццам бы на падставе тэксту з нейкай рукапіснай хронікі, знойдзенай ў зборы рукапісаў Вярцінскага, каморніка Лідскага павета, памёрлага пры канцы XVIII ст., склаў цэлую аповесць пра тое, як у 1242 г. князь Эрдзівіл у Лідскім павеце, на раўнінах, у месце якое да гэтага часу называецца Шайбакполе, разбіў татарскага хана Шайбака, які тут і загінуў. Гэты ж аповед Нарбут паўтарыў у *Кароткім нарысе дзеяў Літоўскіх (С. 72-74.)*, дадаўшы: *"Як памяць пра бой паміж Шайбакполем і Лебёдкай Францкевіча, каля фальварка Курган, ляжыць надмагільны камень з славянскім надпісам, з якога чытаецца слова “Шайбак”*. Адам Кіркор запэўніваў, што быў на тым месцы і сам асабіста бачыў гэты найстарэйшы і найцікавейшы ў краі камень-помнік, на якім ён прачытаў дату "15 чэрвеня 1242 г.", гэты аўтар пакінуў апісанне гэтага каменя *(Известия Императорского Археалогического Обш. 1857 г. I. С. 124., Виленский Вестник 1864 г. № 46.)*. Гэты камень як быццам меў 4 футы і 10 цалей даўжыні і 2 футы шырыні і каля 8 - 10 цалей таўшчыні. Не гледзячы на такія малыя памеры каменя (бо тут жа на палях, ляжаць надта вялікія камяні), невядомы нам уладальнік Лябёдкі, пасля знішчэння на гэтым помніку малюнкаў і надпісаў, ужыў яго як надмагілле на магілу сваёй жонкі.

Так што і крыніцы Віленскага каморніка і само існаванне магільнага каменя са славянскім надпісам і хрысціянскай дадай пахавання татарскага хана - па меншай меры сумніўныя, тым больш, што аповед Нарбута не знаходзіць у вядомых гістарычных крыніцах ніякага пацверджання, і таму увесь аповед пра бітву ў Шайбакполі неабходна лічыць выдумкай Нарбута і Кіркора і выкрасліць з гісторыі.

*Пераклад Леаніда Лаўрэша.*



№ 32 (1235) 12 ЖНІЎНЯ 2015 г. Наша слова

*Мова дзіўная твая птушкало лунае...*

# Шаркоўшчынскі "Світанак": Міледзій Кукуць

Пра родную мову гавораць, пішуць, спрачаюцца шмат: як павярнуць да яе беларуса, і ці ёсць у тым патрэба. Назіраецца, і гэта не сакрэт, перавага русіфікацыі мовы. Нехта бярэ на сябе адказнасць прагназаваць, што яна наогул хутка, знікне, таму што паступова вымірае. Становішча балюча і трывожна: няўжо мы настолькі глухія, што не чуем з глыбінь вякоў запавет - мальбу Францішка Багушэвіча: ***"Брацтцы мілыя, дзеці зямлі - маткі маёй!.. Не пакідайце ж мовы нашай, каб не ўмёрлі!"***.

Але іншы раз, калі пашчасціць апынуцца ў творчым асяроддзі пісьменнікаў, мастакоў, музыкаў і проста аматараў роднага слова - прыхільнікаў беларушчыны, разумееш, што не так ўсё дрэнна. Носьбітаў і абаронцаў роднай мовы - прыгожай, самабытнай, ласкавай, пяшчотнай, далікатнай - дастаткова, каб яна жыла і гучала. Вялікая роля ў гэтай справе належыць пісьменнікам. У буйных гарадах яны збіраюць вялікія аўдыторыі слухачоў, ладзяць канферэнцыі чытачоў у бібліятэках, літаратурныя гасцёўлі. Ім лягчэй выдаць свае кнігі, друкавацца ў часопісах, арганізоўваць кніжныя выставы.

Мэта майго допісу- расказаць пра тое, як працуюць пісьменнікі ў глыбінцы. У адным з нумароў "Нашага слова" шаноўны чытач пазнаёміўся з жывой народнай мовай твораў самабытнага майстра слова Віктара Лагуна.

Сёння я прапаную пазнаёміцца з творчым партрэтам яшчэ аднаго сябра народнага літаратурна-музычнага аб'яднання "Світанак" (г.п. Шаркаўшчына) - Міледзіем Кукуцём.

Ён - паэт і празаік, сябар СПБ. На ягоным творчым рахунку некалькі зборнікаў вершаў і апавяданняў ("Адзін дзень і ўсё жыццё", "Чысціня душы", "Сялянскі лёс", удзел у зборніку "Шаркоўшчынскаму краю".

За аповесць "На сёмым небе" пісьменнік атрымаў узнагароду "Сярэбраны Купідон" у намінацыі "Лепшая кніга года" на свяце "Дня беларускага пісьменства" ў 2014 г.

Прадстаўлю творцу - земляка перш за ўсё як паэта-лірыка.

Міледзій Кукуць прыйшоў у літаратуру са сталым вопытам і веданнем жыцця, паўнавартаснай ацэнкай агульначалавечых каштоўнасцяў, папрацаваўшы электрыкам, інжынерам-механікам, старшынём калгаса. Прырода надзяліла яго паэтычным дарам, таму пачаў пісаць вершы. Каб




падзяліцца з людзьмі сваім светаўспрыманнем, выказаць свае пачуцці, паказаць пры дапамозе роднага слова хараство прыроды роднага краю, раскрыць талент і характар беларуса-працаўніка.

Беларуская мова загучала ў вершах мясцовага паэта зразумела, ясна, сціпла, пяшчотна, спеўна.

Шаркоўшчынскі пісьменнік, творчасць якога любяць землякі, ведаюць у Беларусі і за яе межамі, належыць да кагорты тых творцаў, жыццё якіх непарыўна звязана з роднай зямлёй, яны - ад родных ніў.

Будучы паэт нарадзіўся ў простай працавітай сялянскай сям'і, дзе з ранняга ўзросту дзяцей прывучалі да працы. Луг, поле, жытнёвая ніва, лес, рака, аблокі ў нябесны высі - вось асяроддзе дзяцінства і падлетка. Адвечнае, крыху таямнічае і цалкам неспазнанае яно фармавала натуру будучага паэта. Пазней ён напіша:

*Як родная нівы каласок,*
*Я прабіваўся праз пясок.*
*Я прабіваўся праз жарству.*

Толькі шчырая чыстая душа можа заглядзецца на прыгожую кветку і закахацца ў яе:

*Побач з чыстаю крынічкай*
*Над крыштальнай вадой*
*Твар пяшчотная лілея*
*Мые лілейскай расой.*
.......................................
*Закахаўся я ў лілею,*
*Што вачэй не адарваць.*
*("Лілея")*

Толькі чулае сэрца можа трывожыцца адлёт жураваў у вырай:

*Важак у неба чараду ўздымае,*
*І чутны клікі поўныя журбы.*
*Трывога жалем*
*сэрца напаўняе...*
*("Жураўы")*

Яго цешыць чыстая крынічка, якая бруіць у лузе:

*І хораша, цёпла і весела з ёй -*
*З цудоўнай крынічкай,*
*з гаючай вадой.*
*("Крынічка")*

Радуюць бярозкі каля ракі, якім "нізка б'юць паклоны гнуткія лозы".

*На сэрцы суцешна:*
*красуні-бярозы*
*Стаяць па-над рэчкай*
*ля самай вады.*
*("Бярозкі")*

"Душа мая прагне прастору," - прызнаецца паэт:

*У вершах лунаю за хмарамі я*
*Над сінімі хвалямі бору.*
*У іх я жыву...*

Самотны дуб на ўскрайку вымершай роднай вёскі, "адзіны як вартавы і дзядоў магіл", бусляня, якое ўзнімаецца на крыло, вясёлка ў небе над духмянымі ліпельскімі пракосамі, спелае зерне, што "ў жніво сыплецца ў жменю", - нішто не выпадае з пільнага зроку мастака слова і падаецца то пранізліва шчымліва, то светла, радасна і ўрачыста.

У паэта шмат вершаў, прысвечаных каханню, іншы раз мройнаму і нязбытнаму, светламу і шчасліваму, аддананаму і вернаму.

*Шчаслівая сэрца пачынае біцца.*
*Ты чым абуджана, душа мая?*
*Чаму начамі летнімі не спіцца?*

Паэзія Міледзія Кукуця ўслаўляе жанчыну - маці, чыя "пяшчота памагае сагрэць душу, каб чэрствай не была", жанчыну - гаспадыню, каханую і жонку:

*Давайце шанаваць жанчын,*
*Бо шчасце нам яны вяшчуюць.*
*("Давайце шанаваць*
*жанчын")*

Паэт таксама паспяхова спрабуе пяро ў гумарыстычным і сатырычным жанры.

І ўсё ж галоўнымі стрыжнямі тэматыкі паэзіі Міледзія Кукуця з'уляюцца тры іпастасі, вызначаныя ў вершы глыбоцкага паэта Алеся Жыгунова:

*Нам у спадчыну*
*словы дадзены:*
*Жыта. Бацькаўшчына, Народ.*

Надзейны падмурак, на якім будуе свой паэтычны храм паэт-шаркаўчанін, - гэта спадчыннасць продкаў: родная зямля з спрадвечнай і святой хлебнай нівай, мова бацькоў, народ, прадстаўніком якога з'яўляецца беларус - селянін. Ён - "на зямлі гаспадар, не батрак", і гэта радуе сэрца паэта, які не ўтойвае сваёй роднасці з лёсам мужыка:

*Я з лёсам мужыка знаёмы,*
*Бо з першых крокаў на зямлі,*
*Жыцця сялянскага законы*
*Чытаў на свежае раллі.*
*("Бо я мужык")*

Зямля, хлеб, колас, зерне, жніво, збажына, ніва, жыта, ураджай, поле, мазалі, сялянскі лёс - лексемы, якія часта сустракаюцца ў вершах. Гэта моцна звязаныя і галоўныя паняцці, без якіх усё астатняе - нішто, таму што вызначаюць жыццё як існаванне чалавека: "Будзе хлеб, будзе і песня".

"Цалуючы колас, жыццё я цалую", - піша паэт. Нездарма славяне ў глыбокай старажытнасці называлі жытнёвую палоску-ніўку "жыццём", якая ва ўсе часы палітая потам селяніна-хлебароба.

*З зямлёю навекі*
*звязаўшы свой лёс,*
*Я не цураюся, а ганаруся,*
*Што я селянін,*
*Беларусам завуся.*
*("Успаміны, успаміны")*

Не на слых ведаючы цяжкую працу селяніна, з павагай піша пра людзей працы і шчыра жадае:

*Каб сілы набраўся*
*наш люд працавіты,*
*Усімі забыты,*
*ды толькі не Богам.*
.....................................
*Таму услаўляю у вершах зямлю*
*І тых, хто на ёй сее жыта.*

Прыдзісненшчына - малая радзіма паэта, "край блакітных азёр і духмяных лугоў, і шматлікіх балот, і цяністых лясоў" - Бацькаўшчына. З асаблівай любоўю і ласкавасцю ён піша пра раку Дзісну ("Дзісёнку" па-мясцоваму). Светлая і павольная ў атачэнні маляўнічых берагоў, якую паэт Віктар Лагун назваў "паняй Вабнай", а дзе вірлівая і разлiўная ў паводку, рака апаэтызавана ў многіх вершах Міледзія Кукуця.

Азёрны і бярозавы родны край - адзіны зямны рай для паэта, якому не трэба шукаць лепшай красы, тут ён адпачывае душой "пасля стомы дня".

*Я вельмі рад, што вырас тут,*
*Што край бяроз -*
*мая Радзіма.*
*("Бярозавы край")*

Верш "Шаркоўшчынскі край" пакладзены на музыку віцебскім кампазітарам А. Яцкевічам і выконваецца на раённых урачыстасцях як гімн хорам "Спадчына" Раённага цэнтра культуры. Паэт услявіў у вершы родны край, дзе квітнеюць Сікоравы сады, дзе складаў вершы Міхась Машара, вандраваў Язэп Драздовіч і маляваў мясцовым жыхарам дываны, макаткі, карціны:

*Майстэрства людзям,*
*талент ён дарыў*
*За хлеб і соль*
*і не жадаў другога.*
*("Вандроўнік")*

Хтосьці з творчых людзей выказаў думку, што душа паэта павінна быць такой, як у дзіцяці: непасрэднай, чыстай, даверлівай, шчырай, добрай, захапляльнай, летуценнай. Ад гэтага залежыць: ці паверыць табе, ці прымуць сэрцам тое, аб чым ты пішаш. Вершы Міледзія Кукуця не пакідаюць чытача абыякавым: кранаюць, радуюць, захапляюць, здзіўляюць. Ён не заканчваў Літаратурнага інстытута. За яго плячыма - Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія і праца на зямлі. Але хіба можна навучыць таму, чаго не адчувае душа, без чаго не б'ецца сэрца. Без гэтага паэзія ператвараецца ў рамяство.

Лірык і рамантык ён:

*Сабраў я свае вершы*
*ў самы квецень.*
*Каб людзям падарыць*
*у зорны май.*
.......................................
*Бы краскі заплятаў я*
*ў вяночак*
*Свае радкі, што веялі вясной*
*("Душа паэта")*

Мова вершаў паэта - адлюстраванне яго душы. Яна зразумелая і сціплая без залішняй мажлівасці і ў той жа час багатая мастацкімі сродкамі (эпітэтамі, метафарамі, параўнаннямі), якія надаюць ёй прыгожасць і самабытнасць. У вершы "Распраў жа плечы, беларус" паэт заклікае:

*І май свой гонар,*
*мовай даражы.*

Зараз Міледзій Кукуць працуе начальнікам аддзела дзяржтэхнагляду Шаркоўшчынскага райвыканкама. У вольны час у складзе "Світанка" і асабіста сустракаецца з чытачамі бібліятэк, з вучнямі школ, удзельнічае ў розных культурных мерапрыемствах раёна. Лічыць, што справа паэта - "узносіцца спевам крылатым".

Цячэ па Шаркаўшчынскай зямлі Дзісёнка, "гартае старонкі жыцця" паэта і яго гады. А ён жыве, каб "ніву араць, сеяць зерне ў зямлю", шчыраваць на паэтычнай ніве і даносіць у вершах да людзей родную мову, якую передалі нам у спадчыну продкі.

*Не кожны*
*да гэтага часу дажыў,*
*Хто потам зямельку*
*сваю акрапіў.*
*Ды я застаюся,*
*каб вершы пісаць,*
*Каб людзям пра гэты*
*свой час расказаць.*
*("Успаміны. Успаміны")*

У добры час!

***Людміла Ардынская**, сябар народнага літаратурнага-музычнага аб'яднання "Світанак", г.п. Шаркаўшчына.*

*Рэдактар Станіслаў Вацлававіч Суднік*

***Заснавальнік:***
ТБМ імя Францішка Скарыны.
***Пасведчанне аб рэгістрацыі*** № 908 ад 18 снежня 2009 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
***Адрас рэдакцыі:***
231293, Лідскі р-н, в. Даліна.
***Адрас для паштовых адпраўленняў:***
231282, г. Ліда-2, п/с 7.
***E-mail:*** naszaslowa@tut.by

***Рэдакцыйная калегія:***
Алена Анісім, Юрась Бабіч, Юля Бажок, Марыя Баравік, Вінцук Вячорка, Аляксей Карпенка, Эла Оліна, Ігар Пракаповіч, Аляксей Пяткевіч, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў, Дзяніс Тушынскі, Аляксей Шалахоўскі.

**http://naszaslowa.by/ http://pawet.net/**
**http://kamunikat.org/ http://tbm-mova.by/**
**http://nashaslova.mns.by/**

***Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзеная інфармацыі***

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г. Ліда, вул. Ленінская, 23.
Выдавец: Установа інфармацыі "Выдавецкі дом ТБМ".
Газета падпісана да друку 10.08.2015 г. у 17.00. Замова № 2651.
Аб'ём 2 друкаваныя аркушы. Наклад 2000 асобнікаў.
***Падпісны індэкс:*** 63865.
***Кошт падпіскі:*** 1 мес.- 8750 руб., 3 мес.- 26250 руб.
***Кошт у розніцу:*** па дамоўленасці.